Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!
Proletarjusze wszystkich krajów, łączcie się!
Пролетарии всех стран, соединяйтесь

САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ

15-ты ГОД КАСТРЫЧНІЦКАЙ РЭВАЛЮЦЫІ

ОРГАН ЦВК і СНК БССР
XIII ГОД ВЫДАНЬНЯ
штодзённая газэта

ПЯТНІЦА 5 ЖНІЎНЯ 1932 г.
№ 172 (3551)

ТЭЛЕФОНЫ:
Адказн. рэдактара 7-69
Адказн. сакратара . 4-78
Сэктароў 6-15
Начная рэдакцыя . 12-85 (два званка)
Выдавецтва . . . 2-44

УСЮЫПОДПІСКІ
1 месяц . . . 1 руб.
3 „ . . . 3 „
6 „ . . . 6 „
Падпіска прымаецца выключна на пошце і лістаносцамі.
Рукапісы не зьвяртаюцца

РЭДАКЦЫЯ І ВЫДАВЕЦТВА
МЕНСК, ПЛЯЦ ВОЛІ, 17.

КОШТ АБ'ЯВЫ
1 квадратовы 1 руб

КОШТ ПУБЛІКАЦЫІ
аб згубе 1 дакумэнту—2р.

Сеньня у нумары

ПЕРАДАВЫ: Камунальную гаспадарку—на ўзровень задач сацбудаўніцтва.

АБ ПАПУЛЯРЫЗАЦЫІ І ВЫКАНАНЬНІ ПАСТАНОЎ ЦВК БССР, ПРЫНЯТЫХ на III СЭСІІ ЦВК БССР X СКЛІКАНЬНЯ.

Пастанова ЦВК БССР (1ая стар.).

Усебеларуская сталінская культэстафэта (3-ая стар.).

ДАЦЬ у 3 КВАРТАЛЕ ТАВАРАЎ ШЫРСПАЖЫВУ НА 18.000 руб. (3-ая стар.).

Да гадавіны адозвы ЦК УсеКП(б) і СНК СССР аб прамаджім харчаваньні (3-ая стар.).

АБ ГАРАДЗКІМ КАМУНАЛЬНЫМ БУДАЎНІЦТВЕ Ў БССР.

Пастанова ЦВК БССР (2-ая стар.).

Сёмы тыраж сустрэць поўным завяршэньем рэалізацыі і афармленьня падпіскі на пазыку ў вёсцы (2-я стар.).

Лён трэба сартаваць пры перабленьні (2-ая стар.).

ЗА ГРАНІЦАЙ (1-ая і 4-ая стар.).

Аб папулярызацыі і выкананьні пастаноў ЦВК БССР, прынятых на III Сэсіі ЦВК БССР X скліканьня

Пастанова Прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Беларускай ССР

Надаючы надзвычайную ўвагу неабходнасьці давядзеньня да шырокіх мас рабочых, калгасьнікаў і працоўнага сялянства, а таксама забясьпечаньня выкананьня ўсімі савецкімі органамі пастаноў 3-й Сэсіі ЦВК БССР, Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР ПАСТАНАЎЛЯЕ:

1. Даручыць РВК і гарсаветам распрацаваць канкрэтныя пляны папулярызацыі пастаноў 3-й Сэсіі з тым, каб гэтыя рашэньні былі даведзены да кожнага сельскага, местачковага саветаў, сэкцый, дэпутацкіх груп саветаў, саўгасаў, калгасаў, МТС і працоўнага насельніцтва.

2. Для забясьпечаньня шырокага азнаямленьня савецкіх органаў і ўсіх працоўных з пастановамі Сэсіі—РВК і ўсім саветам правесьці пленумы сельсаветаў, дэпутацкіх груп, з актывам, на якіх паставіць даклады аб пастановах Сэсіі. Уключыць прапрацоўку гэтых рашэньняў на агульных сходах у вёсках. У час правядзеньня ўборачнай кампаніі—шырока разгарнуць работу ў полі, брыгадах, групах, нарадах праз спэцыяльныя даклады і гутаркі. Уцягваць у гэту справу шырокія колы калгасьніц і аднаасобніц сялянак.

3. РВК і гарсаветам забясьпечыць канкрэтную рэалізацыю рашэньняў Сэсіі. Кожная савецкая ячэйка (сэкцыя, дэпутацкая група), кожны сельсавет прымаюць канкрэтныя абавязкі па выкананьні асобных пастаноў Сэсіі, з пастаноўкай шырокага кантроля выкананьня.

4. НК РСІ разам з Арг-інструктарскім Аддзелам Прэзыдыуму ЦВК праз 3 мес. правяраць выкананьне пастаноў Сэсіі. На працягу жніўня і верасьня месяцаў заслухаць даклады аб папулярызацыі гэтых пастаноў і іх практычным ажыцьцяўленьні РВК, гарадзкімі і сельскімі саветамі, з садакладамі сэкцый і дэпутацкіх груп.

Аргінстру Прэзыдыуму ЦВК забясьпечыць падачу вынікаў папулярызацыі пастаноў Сэсіі 15-VIII г. г.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР
А. ЧАРВЯКОЎ.

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР
М. ГНІЛЯКЕВІЧ.

Дэпутацкія групы заводаў імя Варашылава і „Камунар" прымаюць пуцёўку імя III сэсіі ЦВК

Выканаць узятыя абавязкі

Дэпутацкая група заводу «Бальшавік» перад III сэсіяй ЦВК рапартавала аб сваіх посьпехах у выкананьні і перавыкананьні прамфінпляну і поўным ажыцьцяўленьні шасьці ўмоў тав. Сталіна.

Разам з гэтым дэпутацкая група ўзяла шэфства над пабудовай пасёлку «Камінтэрн», пракладкай трамвайнай лініі і выклікала другія дэпутацкія групы: гарбарні імя Сталіна (Магілёў), Віцебскага скурзаводу і дэпутацкую групу фабрыкі «Праца» (Гомель) з тым, каб узяць шэфства над камунальным будаўніцтвам, перанесьці свой вопыт, набыты ў барацьбе за выкананьне шасьці ўмоў тав. Сталіна, прасачыць і своячасова скончыць пабудову тых аб'ектаў камунальнага будаўніцтва, якія вызначаны партыяй і ўрадам для сканчэньня ў 1932 г.

Выклік прыняты, але на сёньнішні дзень дэпутацкая група заводу «Бальшавік» нават не распачала работы па рэалізацыі ўзятых на сябе абавязкаў.

На запытаньне ў старшыні дэпутацкай групы тав. Шыманоўскага, як правадзіцца ў жыцьцё ўзятае імі абавязацельства перад адкрыцьцем III сэсіі ЦВК—тав. Шыманоўскі адказаў Да гэтага часу па выкананьні прынятага намі абавязацельства нічога яшчэ ня зроблена».

Невыкананьне гэтага важнейшага абавязацельства, узятага дэпутацкай групай у гонар III сэсіі ЦВК сьведчыць, што з боку парткалектыву і прафкому ня было ніякага кіраўніцтва дэпутацкімі групамі.

Дэпутацкая група заводу «Бальшавік» павінна разгарнуць у самы кароткі тэрмін жорсткую барацьбу за пасьпяховае разгортваньне гарадзкога будаўніцтва, за культурнае жыльлё, за чыстату ў горадзе, за тое, каб у ім было больш зялёных насаджэньняў, за брукаваную вуліцу, за трамвай і г. д.

Абавязацельствы ўзятыя ў гонар III сэсіі ЦВК не павінны застацца глухой дэклярацыяй ,яны павінны быць ператвораны ў канкрэтныя справы.

Пастановы III сэсіі ЦВК павінны зьявіцца баявой праграмай дзейнасьці для ўсіх дэпутацкіх груп. Мы таксама патрабуем каб дэпутацкія групы гарбарні Сталіна, Віцебскі скуразавод і Гомельская фабрыка «Праца» прынялі выклік «Бальшавіка» і па паявому ўзяліся за рэалізацыю пастаноў партыі і ўраду аб камунальным будаўніцтве.

К-ко.

Прывітаньне Цэнтральнага Камітэту ЦК КП(б)Б--газэце „Рабселькор"

«Рабселькор»—баявой газэце рабселькораў «Савецкай Беларусі», Цэнтральны Камітэт КП(б)Б шле палкае прывітаньне ў дзень выхаду сотага нумару.

Задача газэты—не застыць на тых бязумоўных значных дасягненьнях, якія ёсьць у яе рабоце, а ўсімі сіламі, усёй сваёй работай забясьпечыць далейшы ўздым якасьці работы, своячасовую мабілізацыю нізавога, радзіннага друку і рабселькораў на выкананьне асноўных гаспадарча-палітычных задач, што ставяцца партыяй, забясьпечыць высокі палітычны ўзровень ва ўсёй рабоце газэты.

Газэта «Рабселькор»—орган Культпропу ЦК, выданьне «Звязды»—павінна з яшчэ большай энэргіяй змагацца за самыя ўважлівыя, чулыя адносіны ўсіх зьвеньняў нашага друку да лістоў рабочых, калгасьнікаў, беднякоў і сераднякоў-аднаасобнікаў, газэта павінна яшчэ больш узмацніць сваю сувязь з прадпрыемствамі, калгасамі, саўгасамі і МТС. Трэба памятаць, што пытаньне аб гэтых лістох, аб іх правільным і поўным скарыстаньні мае вялізарнае прынцыпова-палітычнае значэньне.

«Рабселькор» павінен зараз з асаблівай сілай мабілізаваць нізавы друк і рабселькораў на ўзмацненьне барацьбы за прамфінплян, за 6 гістарычных умоў тав. Сталіна, на выкананьне задач уборачнай і загатоўчай кампаній і падрыхтоўкі да разьмеркаваньня ўраджаю, як задач, якія забясьпечваюць посьпехі барацьбы за арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў—цэнтральную задачу калгаснага будаўніцтва на даным этапе.

Пытаньні сыстэматычнай барацьбы за ўзмацненьне абароназдольнасьці савецкай краіны, няўхільнага ажыцьцяўленьня ленінскай нацыянальнай палітыкі, барацьбы за далейшае разгортваньне пралетарскай самакрытыкі,—на вінны быць заўсёды ў цэнтры ўвагі газэты.

Падкрэсьліваючы значныя дасягненьні газэты, трэба разам з тым, звярнуць асаблівую ўвагу на зьніштэньне асобных слабых месц у рабоце газэты «Рабселькор», якімі зьяўляюцца не да волі поўная пастаноўка тыпаньняў калгаснага гандлю, прасоўваньня гаварэў шырокага спажываньня ў вёсцы і, аднолькавага часу, слабая дапамога нізавому друку тарфяных заводаў і прадпрыемстваў па вырабе будаўнічых матар'ялаў.

Цэнтральны Камітэт КП(б)Б упэўнен, што «Рабселькор» і надалей будзе з гонарам выконваць тыя адказьнейшыя задачы, якія на яго ўскладзены ЦК КП(б)Б, як на кіруючую газэту, па пытаньнях рабселькораўскага руху, раённага і нізавога друку, будзе і надалей настойліва і пасьлядоўна змагацца на два фронты, супроць правых—галоўнай—небясьпекі, супроць «левых» загібаў і прымірэнцтва да ўхілаў, за генэральную лінію партыі.

Сакратар Цэнтральнага Камітэту КП(б)Б—В. ШАРАНГОВІЧ.

Рэдакцыі газэты „Рабселькор"

Вітаю вас з выпускам сотага нумару вашай газэты. «Рабселькор» ужо адыграў вялікую арганізатарскую і палітычную ролю ў справе мабілізацыі шырокіх мас рабочых, калгасьнікаў і ўсіх працоўных на выкананьне практычных задач вялікай сацыялістычнай будоўлі і па камуністычным выхаваньні арміі рабселькораў Беларусі. Пры дапамозе газэты «Рабселькор», якая вядзе няўхільную барацьбу за генэральную лінію партыі, за ленінскую нацыянальную палітыку—вырасьлі новыя сотні і тысячы змагароўна фабрыках, заводах, у калгасах і вёсках, якія ўжо ўключыліся ў практычную працу па будаўніцтве сацыялістычнай гаспадаркі і культуры, нацыянальнай па форме і сацыялістычнай па зьместу. Рабселькоры папаўняюць новымі сіламі рады культурных, мастацкіх працаўнікоў і рады пралетарскіх пісьменьнікаў.

У далейшым прадстаіць вялікія задачы па пабудове бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва. На выкананьне гэтых задач неабходна яшчэ шырэй мабілізаваць усю савецкую грамадзкасьць. Застрэльшчыкамі гэтай мабілізацыі павінны быць рабселькоры, прыгоўчыя пад кіраўніцтвам нашай партыі і па яе ўказаньнях.

Жадаю посьпехаў у далейшай працы. Пасылаю шчырае прывітаньне ўсім рабселькорам праз вашу газэту.

Нахай жыве камуністычная партыя—надзейны кіраўнік усяго сацыялістычнага будаўніцтва і кіраўнік рабселькораўскага руху!

Нахай жыве камуністычная партыя сусьветнага пралетарыяту!

ГАЛАДЗЕД.

Камунальную гаспадарку--на ўзровень задач сацбудаўніцтва

Рабочая кляса БССР пасьля Кастрычнікаўскага перавароту атрымала ў спадчыну ад царска-чыноўніцкай Расіі надзвычай адсталую, разбураную гарадзкую гаспадарку.

Гарадзкая гаспадарка БССР, будучы наогул вельмі адсталай, прышла ў часе імпэрыялістычнай вайны і белапольскай акупацыі ў яшчэ большы заняпад. Цэлыя кварталы былі зусім разбураны. Электрычныя станцыі, водаправоды ў радзе гарадоў былі ў поўным развале.

Пасьля вызваленьня БССР ад белапалякаў, партыя і ўрад накіравалі ўсе сілы, сродкі і волю пралетарыяту і працоўных мас у першую чаргу на адбудову прамысловасьці і сельскай гаспадаркі.

Адноўлена і пабудавана ў буйных гарадох (Менск, Віцебск, Гомель, Магілёў) 752 тыс. кв. мтр. жылой плошчы. Пабудавана 20 электрастанцый, магутнасьць якіх увогуле ўзьнялася з 390 да 14.943 квт.

У сталіцы БССР Менску пераабсталявана электрастанцыя, якая сёньня дае 6.700 квт. замест ранейшых 300 і вада правод замест ранейшых 1.728 куб. мтр. сёньня ўжо дае 7.600. Будуецца магутная цёплаэлектрацэнтраль і водаправод, якія павінны цалкам забясьпечыць Менск водой і электраэнэргіяй. Апроч таго, цёплаэлектрацэнтраль будзе забясьпечваць і прыгарадныя калгасы, саўгасы і вёскі электраэнэргіяй.

Каналізацыяй ахоплены сотні дамоў. Даўжыня магістралі зараз дасягае 25 клм. Конка з яе шаўможкамі—кляча-мі адыйшла ў далёкае мінулае. Сёньня ў Менску мы маем трамвай, лінія якога пашыраецца з кожным днём і ў гэтым ўжо годзе дойдзе да 38 кілёмэтраў даўжыні.

Тысячы рабочых сем'яў пераселены з сутарэньняў і ваколіц у цэнтральныя кварталы, у былыя панскія кватэры. На акраінах гораду шпаркімі тэмпамі будуюцца рабочыя пасёлкі.

Гэтакія вялізарныя посьпехі мае ня толькі камунальная гаспадарка Менску, але-ж і іншыя гаспадаркі БССР.

Асабліва магутны размах набывае камунальнае будаўніцтва ў 1932 годзе. Праграма будаўніцтва ў 1932 годзе прадугледжвае ў асноўных рабочых цэнтрах рад мерапрыемстваў накіраваных на далейшае палепшаньне бытавога і культурнага абслугоўваньня працоўных. У Менску ў гэтым годзе павінна быць пабудавана 2.000, у Віцебску—680, у Гомлі—700 рабочых кватэр, а таксама дамоў спэцыялістаў з усімі камунальнымі і культурнымі выгадамі.

Нарэшце, дзьве яскравыя лічбы, якія характарызуюць маштаб росту выканкомаў і жылкаапэрацый на какамунальнай гаспадаркі. Так, калі ў 1925 годзе было выдаткавана на лініі мунальнае будаўніцтва 4.380 тыс. руб., дык у 1932 годзе на гэтыя мэты павінны быць выдаткавана 11 млн. руб.

Вось вынікі 12 год упартай работы па аднаўленьні і сацыялістычнай рэканструкцыі гарадоў БССР, ператварэньні іх ва ўзорныя пралетарскія цэнтры.

Аднак, ня гледзячы на вялізарныя дасягненьні, сучаснае становішча гарадзкой гаспадаркі не здавальняе ўзрастаючыя запатрабаваньні рабочых мас. Гарадзкая гаспадарка адстае ад агульнага разьвіцьця сацыялістычнага будаўніцтва. «Рабочы цяпер ня тое, што раней. Цяперашні рабочы, наш савецкі рабочы, хоча жыць з пакрыцьцём усіх сваіх матар'яльных і культурных патрэб і ў сэнсе харчовага забясьпечаньня і ў сэнсе жыльля, і ў сэнсе забясьпечаньня культурных і ўсякіх іншых патрэб. Ён мае на гэта права і мы абавязаны забясьпечыць яму гэтыя ўмовы». (Сталін).

Гэтыя словы правадыра з усёй выразнасьцю падкрэсьліў чэрвеньскі Пленум ЦК УсеКП(б)Б, які сказаў, што «задача складаецца у тым, каб разгарнуць работу па пашырэньні, перабудове і разьвіцьці гарадзкой гаспадаркі прыстасоўна да патрабаваньняў, якія прад'яўляюцца зараз бурнымі тэмпамі індустрыялізацыі, павялічэньнем гарадзкога насельніцтва, ростам бытавых і культурных патрэб шырокіх працоўных мас». З гэтых рашэньняў поўнасьцю выцякае пастанова ЦК КП(б)Б і СНК БССР аб разьвіцьці камунальнай гаспадаркі. Але гэтыя дырэктывы партыі і ўраду кіраўнікі НК камунальнай гаспадаркі не выканалі.

Зьмешчаная намі сёньня пастанова ЦВК БССР аб гарадкзім камунальным будаўніцтве з усёй выразнасьцю падкрэсьлівае нездавальняючую работу НК камунальнай гаспадаркі. Перабудова гарадзкой гаспадаркі БССР пасьля чэрвеньскага пленуму ЦК УсеКП(б) і рашэньняў ЦК КП(б)Б і СНК БССР аб камунальнай гаспадарцы зусім не адпавядае пастаўленым задачам, і гэтым самым пагражае пасьпяховаму выкананьню пляну 1932 году.

Тлумачыцца тым, што НК камунальнай гаспадаркі да гэтага часу не забясьпечыў сапраўднага кіраўніцтва камунальнай гаспадаркай, ня прыняў дастатковых захадаў па захаваньні існуючага жыльлёвага фонду. Гарсаветы і райвыканкомы не разгарнулі бальшавіцкіх тэмпаў работы і не скарысталі мясцовых магчымасьцяў для выкананьня плянаў будаўніцтва камунальнай гаспадаркі гарадоў і раённых цэнтраў, не мабілізавалі шырокія масы рабочых на барацьбу за выкананьне плянаў камунальнага і жыльлёвага будаўніцтва.

Замест плянавага і апэрацыйнага будаўніцтва, гарсаветы і камгасы яшчэ да гэтага часу займаюцца дробнай апекай над камунальнымі прадпрыемствамі. ЦВК у сваёй пастанове абавязвае НК камунальнай гаспадаркі, гарсаветы і райвыканкомы безадклад на перабудаваць сваю работу ў напрамку забясьпечаньня канкрэтнага апэрацыйнага кіраўніцтва ўсёй камунальнай гаспадаркай і ў бліжэйшы час да памагчы пералому па ўзьняцьці камунальнай гаспадаркі, праводзячы жорсткую барацьбу за ажыцьцяўленьне 6 умоў тав. Сталіна, укараненьне гаспадарчага разьліку, разгортваючы сацспаборніцтва і ўдарніцтва, ліквідуючы абязьлічку ў камунальнай гаспадарцы з тым, каб забясьпечыць поўнае выкананьне плянаў камунальнага і жыльлёвага будаўніцтва 1932 году.

Адзначаючы неўпарадкаваньне плянаваньня гарадоў, і наяўнасьць хаотычнасьці ў іх забудове, ЦВК даручыў НК камунальнай гаспадаркі прысьпешыць работу па плянаваньні і ўсю гэту работу сканцэнтраваць у органах НК камунальнай гаспадаркі, забясьпечыўшы фінансаваньне намечаных работ.

Толькі на падставе ажыцьцяўленьня ва ўсёй сыстэме камунальнай гаспадаркі 6-ці ўмоў тав. Сталіна, правядзеньня рашучай барацьбы з правапартыйнымі настроямі, «левымі» загібамі і прымірэнцтвам да іх, — мачыма выканаць пастаўленыя партыяй і ўрадам задачы перад гарадзкой і камунальнай гаспадаркай ў поўнай адпаведнасьці з рашэньнямі чэрвеньскага пленуму ЦК УсеКП(б) і пастановы ЦК КП(б)Б, аб камунальнай гаспадарцы.

Тавары шырспажыву—на калгасны рынак

Мерапрыемствы, высунутыя газэтай «Савецкая Беларусь» па арганізацыі пуцёўкі імя III сэсіі ЦВК даюць дэпутацкім групам праграму дзейнасьці ў сэнсе выкананьня важнейшых пастаноў партыйных і ўрадавых органаў.

Дэпутацкая група заводу «Камунар», лічучы неабходным быць у першых радох змагароў за павялічэньне вырабу тавараў шырокага спажываньня, па арганізацыі дапамогі ў разгортваньні калгаснага гандлю і сустрэчнага патоку прамтавараў на савецкі рынак,—прымае пуцёўку імя III сэсіі ЦВК і заўтра-ж на бюро дэпутацкай групы, з прыцягненьнем грамадзкасьці заводу, бярэцца за прапрацоўку раду канкрэтных мерапрыемстваў па вырабе тавараў шырокага спажываньня, па вышуканьні дадатковых рэсурсаў і па разгортваньні калгаснага гандлю

Дульціна.

Ператворым пуцёўку ў канкрэтны плян дзейнасьці

Прачытаўшы ў газэце «Савецкая Беларусь» ад 3-VIII—32 г. аб уручэньні «пуцёўкі імя III сэсіі ЦВК» гарсаветам і дэпутацкім групам, азнаёміўшыся дэталёва з мерапрыемствамі, які высоўвае гэтая пуцёўка,—дэпутацкая група заводу імя Варашылава ўхваляе ініцыятыву газэты «Савецкая Беларусь», прымае пуцёўку для выкананьня.

Надаючы асабліва важнае палітычнае значэньне правядзеньню ў жыцьцё пастаноў партыйных і ўрадавых органаў па павялічэньні вырабаў тавараў шырокага спажываньня і разгортваньня калгаснага гандлю, бюро дэпутацкай групы зараз-жа бярэцца за прапрацоўку пуцёўкі і вызначэньне канкрэтнага пляну рэалізацыі яе, выходзячы з умоў нашага заводу.

Ад імя дэпутацкай групы зав. імя Зарашылава. ЛЮБЛЮНЕРМАН.

ЗА ГРАНІЦАЙ

На выбарчую перамогу камуністаў--Фашысты адказваюць узмацненьнем тэрору

Кампартыя арганізуе адзіны антыфашысцкі фронт барацьбы

БЭРЛІН. ЦК германскай кампартыі апублікаваў сёньня ў газэце «Дас ротэ Бэрлін» адозву камфракцыі Бэрлінскага муніцыпалітэту. У адозьве канстатуецца, што кампартыя, ня гледзячы на бяскрайні тэрор буржуазіі, аказалася на выбарах у рэйхстаг. 31-га ліпеня адзіная партыяй, атрымаўшай перамогу і гэта зьяўляецца першым доказам гатоўнасьці германскага пралетарыяту да барацьбы супроць фашызму.

«Германскія рабочыя,—гаворыцца ў адозьве,—пад кіраўніцтвам кампартыі атрымалі 31 ліпеня перамогу. Яны ня толькі адбілі спробу фашызму ўварвацца ў рады рабочае клясы, але і завалявалі назад сотні тысяч пралетараў, якія на кароткі час было зрабіліся іх вярамі клясава-варожай дэмагогіі».

Выбары 31 ліпеня зьяўляюцца магутным выразам пераводу мас у бок антыфашысцкага адзінага фронту. Задача зараз заключаецца ў тым, каб пад сьцягамі гэтага антыфашысцкага адзінага фронту прасоўвацца наперад. Ашуканства сацыял-дэмакратычных і рэфармісцкіх правадыроў, а таксама партыі цэнтру,—якія прабавалі пераканаць масы ў тым, што вызваленьне ад фашызацкага прыгнечаньня і тэрору можа быць даасягнута пры дапамозе гадасаваньня, — абвяргаецца фактамі. Першым адказам фашысцкіх уладароў на антыфашысцкую перамогу кампартыі на выбарах зьяўляюцца новыя пагрозы і ўціск над пераможцамі на выбарах, над камуністамі.

Першым вынікам таго, што гітлераўская партыя не атрымала посьпеху, на які яна разьлічвала, і што нацыянал-сацыялісцкая хваля прыпынілася ў сваім росьце, зьяўляецца тое, што заядлыя забойцы з гітлераўскай партыі зрабілі замах на правадыроў і будынкі пралетарыяту ў Кенігсбэргу, Брауншвэйгу, Шлезьвінгу і інш. гарадох. Звыш 100 рабочых сталі за апошнія 5 месяцаў ахвярамі фашысцкага тэрору. Кампартыя заклікае рэвалюцыйныя масы германскіх працоўных да згуртаванай барацьбы ў адзіным масавым фронце супроць фашысцкага тэрору.

Далей адозва заяўляе, што кампартыя падрыхтавана з рашучасьцю змагацца на чале мільёнаў клясава-сьвядомых рабочых і працоўных, гатовых змагацца пад пралетарскім кіраўніцтвам, супроць капіталістычнай сыстэмы, супроць фашызму і ўраду Папэна-Шлейхэра і назначаных гэтым урадам, пры дапамозе дзяржаўнага перавароту, камісараў.

Далей у адозьве гаворыцца: «сёньня, як і перад выбарамі ў рэйхстаг, кампартыя працягвае сацыял-дэмакратычным рабочым, работніцам і моладзі рэфармісцкіх прафсаюзаў і рэйхсбанэра моцную руку для сумеснай антыфашысцкай барацьбы ў чырвоным, адзіным фронце, супроць агульнага ворага».

Напамінаючы, што ў жніўні, верасьні і наступных месяцах канчаюцца тэрміны дзеяньня нарыфных дагавораў і што рыхтуецца новае скарачэньне зарплаты рабочых і служачых, адозва заклікае рыхтавацца да новых забастовак і масавай барацьбы супроць новага замаху на зарплату, а таксама стварыць камітэты адзінства і барацьбы на прадпрыемствах.

Французскі друк аб становішчы ў Германіі

ПАРЫЖ, 3. Увесь французкі друк падае паведамленьні аб тым, што Гітлер рашыў не прадпрыймаць фон-Папэну ультыматуму аб прадастаўленьні нацыянал-сацыялістам канцлерскага і раду іншых пастоў. Як паведамляюць газэты, Гітлеру было вядома, што ўсёроўна яго ультыматум быў-бы адхілены.

Французкі друк яўна задаволены такім паваротам справы. Французкая біржа, як і большасьць друку, схільна лічыць, што ўрад фон-Папэна—Шлейхэра ў сучасных умовах зьяўляецца «меншым злом». Таксама сацыял-фашыст Блюм у «Пэпюлерыі» піша, што з пункту погляду «інтарэсаў германскага пралетарыяту» урад Папэна-Шлейхэра зьяўляецца «меншай небяспекай» у параўнаньні з Гітлерам

Магутная дэманстрацыя ў Нью-Ёрку

НЬЮ-ЁРК, 2. Паведамляючы аб вялікіх выступленьнях 1-га жніўня ў ПАЗШ орган кампартыі «Дэйлі Уоркер» піша:

«Нью-ёркская дэманстрацыя была адной з буйнейшых, якія бачыў Нью-Ёрк за апошнія гады. Першага жніўня нью-ёркскія рабочыя ўзьнялі сьцяг барацьбы супроць імпэрыялістычнай вайны і закліймілі ганьбай напад Гувэра на вэтэранаў вайны».

Шматлікія дэманстрацыі ў Аўстрыі

ВЕНА. 2. Ня гледзячы на забарону ўладай антыфашысцкіх дэманстрацый 1-га жніўня ва ўсіх рабочых раёнах Вены рабочыя дэманстравалі на вуліцах. Паліцыя разганяла іх гумовымі дубінкамі. У рэйхе правінцыяльных гарадох адбыліся шматлікія рабочыя дэманстрацыі, трычым, правядзен рад арыштаў. Паліцыя цяжка ранила некалькі рабочых.

Наступленьне на зарплату рабочых

БЭРЛІН. 3-VIII. Германскія прадпрыемцы разгарнулі новае наступленьне на заработную плату. Тэкстыльныя фабрыканты Саксоніі абвясьцілі аб разрыве 31 (а фактычна 13) жніўня тарыфных дагавораў, рэгулюючых зарплату 250.000 тэкстыльных рабочых.

У Бэрліне гандляры анулявалі тарыфныя дагаворы з 40.000 служачых. Пастановай трацейскага суду рабочым розных каменяломняў пашыжана плата на 8,17 проц. Рабочым дзяржаўных будаўнічых прадпрыемстваў Баварыі, згодна трацейскага рашэньня, зарплата пашжана на 2-3 пфэнінгі.

Дэманстрацыя беспрацоўных у Бэрліне

9 жніўня адбудзецца харчовая канфэрэнцыя ка Бабруйскім лесакамбінаце

(Ад нашага спэцыяльнага карэспандэнта)

На Бабруйскім дрэваапрацоўчым камбінаце імя 10-ці годзьдзя Кастрычніцкай рэвалюцыі разгарнулася вялікая работа на падрыхтоўцы харчовай канфэрэнцыі, якая склікаецца рэдакцыяй газэты «САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ» супольна з трыкутнікам камбінату. Пачынаючы з 29-га ліпеня па камбінаце праходзіць рад нарад, прысьвечаных пытаньням дэталёвай прапрацоўкі кантрольных лічбаў і матар'ялаў, якія будуць зацьверджаны на пленуме канфэрэнцыі.

Тое новае, што характарна для вызначэньня да скліканьня канфэрэнцыі заключаецца ў тым, што кожнаму пасобнаму цэху дана зусім пэўная задача, а імянна: усебакова абдумаць пэўнае пытаньне адзінага пляну рабочага забясьпечаньня. Ва ўмовах камбінату гэта зроблена так: сэкцыю грамадзкага харчаваньня—арганізуе белцэх і пажарная каманда; сэкцыю трусагадоўлі і рыбалоўства—база сыравіны і электрастанцыя; сэкцыю самазагатовак—лесцэх і біржа піламатар'ялаў; сэкцыю шырспажыву і калгаснага гандлю—стандартны цэх і мэханічная майстэрня; сэкцыю забясьпечаньня ўдарнікаў — будаўніны п-аддзел і гараж; сэкцыю сьвінагадоўлі—пільня № 7 і сэкцыю прыгараднай гаспадаркі—транспарт камбінату. Трэба адзначыць, што такое прымацаваньне цэхаў да пасобных сэкцый ужо дае свае практычныя вынікі. На сёньнішні дзень кожны цэх ужо распачаў абмеркаваньне кантрольных лічбаў стварэньня ўласнай харчовай базы і ідзе рэдагаваньне гэтых матар'ялаў у спэцыяльных тройках, створаных для кіраўніцтва работай пасобных сэкцый. Уключэньне пляна вікоў і эканамістаў у работу гэтых троек забясьпечвае прадуманасьць гэтых кантрольных лічбаў і ўвязку з агульна-камбінацкім плянам выпуску гатовай прадукцыі.

Пасьля пастановы, вынесенай партыйным камітэтам камбінату аб скліканьні харчовай канфэрэнцыі, 31-га ліпеня адбывалася шырокая нарада трыкутнікаў усіх цэхаў камбінату, на якой праводзілася праверка ходу пад рыхтоўчай работы да канфэрэнцыі. Неабходна адзначыць, што падрыхтоўка да канфэрэнцыі яшчэ не закранула шырокіх мас рабочых. Пры адносна нядрэнных посьпехах у справе апэрацыйнай падрыхтоўкі да канфэрэнцыі мы яшчэ маем малыя дасягненьні ў прыцягненьні мас да гэтай работы.

Падрыхтоўчая работа да скліканьня канфэрэнцыі супала з работай па пад агульнаньні вынікаў сталінскага паходу і прапрацоўкі пастаноў ліпеньскага пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б і III сэсіі ЦВК. У гэтых умовах работа па правядзеньні харчовай канфэрэнцыі камбінату робіцца значна лягчэйшаю. Трэба адзначыць, што сталінскі паход і прапрацоўка рашэньняў ліпеньскага пленуму ЦК далі значны зрух у работе па рабочым забясьпечаньні і ЗРК. За апошні час узмоцнена ўвага да прыгараднай гаспадаркі, да грамадзкага харчаваньня і да разгортваньня вырабу прадметаў шырокага спажываньня ў мэтах стымуляваньня калгаснага гандлю. Праўда, грамадзкае харчаваньне зьяўляецца самым вузкім месцам у рабочым забясьпечаньні камбінату, але разгортваньне трусатніка і сьвінарніка, загатоўкі ў глыбінных пунктах даюць падставу меркаваць, што ў прамадзкім харчаваньні падыдзе ў бліжэйшы час пералом.

Тое-ж самае можна сказаць аб вырабе прадуктаў шырспажыву. На гэты вучастак работы кіраўніцтва камбінату зварочвае асаблівую ўвагу. Так, БРЫЗ камбінату праводзіць конкурс на лепшую прапанову па выпуску прадметаў шырспажыву. Умовы конкурсу высоўваюць наступныя запатрабаваньні да тых тавараў, якія будуць уносіць рацыяналізатарскія прапановы: а) прадметы шырспажыву павінны быць вызначаны для сяляскага ўжытку, б) сыравінай для гэтых тавараў павінны быць адыходы ад вытворчасьці камбінату, в) выраб іх не павінен патрабаваць новага абсталяваньня або складанай пераробкі існуючага, г) працэсы апрацоўкі дэталяў павінны быць увязаны з працэсамі існуючымі на камбінаце, д) не патрабаваць ужываньня дэфіцытных матар'ялаў (цыбікоў), або вырабаў са скуры ці мэталю).

Значны ўздым актыўнасьці рабочых мас пры правядзеньні сталінскага паходу, згрупаванасьць рабочых вакол партыйнай арганізацыі зьяўляецца гарантыяю, што вялізарная работа, пачатая на камбінаце па стварэньні ўласнай харчовай базы для 5,5 тыс. рабочых пройдзе пасьпяхова. Ад партыйных, прафэсыянальных і камсамольскіх арганізацый камбінату патрабуецца канкрэтнае апэрацыйнае кіраўніцтва ў гэтай важнейшай гаспадарча-палітычнай рабоце.

Пасьпяховае правядзеньне канфэрэнцыі 9-га жніўня павінна пакласьці пачатак рабоце па павялічэньні ў 2—3 разы спажываньня рабочых, якое прадугледжана рашэньнямі 16 партканфэрэнцыі ў пытаньні рэалізацыі вялікага пляну другой пяцігодкі.

2.000 чалавек на мітынгу, прысьвечаным першаму чырвонаму абозу са збожжам

Чэрвень, 4-VIII (Белта). Перадавыя калгасы раёну—„Чырвоны Шлях", „Сьцяг Кастрычніка", „Новы Сьвет" і інш. ужо завяршаюць уборку збожжа і сенажаці і арганізавалі чырвоны абоз са збожжам новага ўраджаю. Абозы здалі (прадалі) дзяржаве 138 цнт. збожжа і 55 цнт. сена.

У адзнаку пэршага чырвонага абозу быў арганізаваны мітынг, на якім прысутнічала больш 2.000 чал. калгасьнікаў, аднаасобнікаў і гарадзкога насельніцтва.

Мабілізаваны ўсё войска і паліцыя

ВЕНА. 2. Паводле паведамленьня з Будапэшту, у антыфашысцкі дзень у Вэнгрыі былі мабілізаваны ўсе ваенныя і паліцэйскія сілы. Па Будапэшце цэлы дзень патрулявалі ваенныя часьці. Аднак, ня гледзячы на гэта ў рабочых раёнах масамі распаўсюджваліся рэвалюцыйныя лістоўкі.

Сёньня ў Менску аб'яднанае паседжаньне конкурсных камісій Украіны, Каўказу і БССР

Сёньня, а 10 гадз. раніцы ў памяшканьні Дому Пісьменьніка (Савецкая вул., д. № 68) пачнецца аб'яднанае паседжаньне камісій Украіны, Паўночнага Каўказу і БССР па правядзеньні ўсесаюзнага конкурсу «Правды» на лепшую работу нізавых газэт па арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў.

На паседжаньні будуць падведзены вынікі спаборніцтва паміж БССР, УССР і Паўночным Каўказам.

Для ўдзелу ў паседжаньні запрашаюцца партыйныя актыў, рабкоры, работнікі цэнтральных і фабрычных газэт, інжынэрна-тэхнічныя работнікі і настаўніцтва.

ЦЭНТРАЛЬНАЯ КОНКУРСНАЯ КАМІСІЯ

„Рабочы хоча жыць з пакрыцьцём усіх сваіх матар'яльных і культурных патрэб" (СТАЛІН)

Аб гарадзкім камунальным будаўніцтве ў БССР

Пастанова Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Беларускай ССР

1. Кастрычніцкая рэвалюцыя карэнным чынам ператварыла гарадзкую гаспадарку з сродкаў эксплёатацыі рабочых мас у сродак абслугоўвання іх матар'яльных і культурна-бытавых запатрабаванняў.

Гарадзкая гаспадарка БССР у часы панаўчыцька-буржуазнага панавання была вельмі адсталай і прыйшла ў поўны заняпад у часы імпэрыялістычнай вайны, нямецкай і асабліва белапольскай акупацыі. Белапалякі, адступаючы пад націскам Чырвонай арміі, руйнавалі пажарам гарады і мястэчкі БССР. Пасьля перамогі над інтэрвэнтамі і скончэньня грамадзянскай вайны БССР, на аснове дасягнутых вялізарных посьпехаў у галіне выканання першай пяцігодкі індустрыялізацыі краіны і сацыялістычнай перабудовы сельскай гаспадаркі, пры дапамозе ўсяго Савецкага Саюзу атрымала магчымасьць шырока разгарнуць перабудову гарадзкой гаспадаркі—гэтага важнейшага мерапрыемства па перабудове і палепшаньні быту шырокіх працоўных мас на новых сацыялістычных пачатках.

2. За гэты час у галіне гарадзкой гаспадаркі, як нераздзельнай часткі ўсяго сацыялістычнага будаўніцтва, БССР мае наступныя асноўныя дасягненьні: пабудавана новай і адноўлена ў асноўных буйных гарадох (Менск, Віцебск, Гомель, Магілеў) 752,3 тыс. кв. мэтраў жылой плошчы, пабудавана 20 электра станцый, магутнасьць якіх павялічылася з 390 да 14.943 клв, а ў гор. Менску з 300 да 6.700 клв.; пабудавана 3 новых водаправоды; магутнасьць водаправоду ў Менску павялічылася з 1.728 куб. мэтраў да 7.600 куб. мэтраў; пабудавана каналізацыя ў Менску пра цягласьцю ў 25 кілёмэтраў; пабудаваны новы трамвай у г. Менску і павялічылася працягласьць трамвайнага шляху з 12 да 38,3 кілёмэтраў, пабудавана 19 лазьняў; пабудаваны дзяржаўны ўнівэрсытэт, клінічны гарадок у Менску і цэлы рад клюбаў, тэатраў; будуецца дом ураду ў Менску, цэплаэлектрацэнтраль у Магілеве, а таксама будуецца цэплаэлектрацэнтраль у Менску, якая будзе абслугоўваць ня толькі Менск, але і навакольныя саўгасы, калгасы і вёскі. Асабліва магутны размах набывае камунальнае будаўніцтва ў 1932 годзе.

3. Праграма будаўніцтва 1932 году прадугледжвае асабліва ў асноўных рабочых цэнтрах рад мерапрыемстваў, накіраваных на далейшае палепшаньне бытавога абслугоўваньня працоўных мас; па Менску 2 тысячы кватэр, пашырэньне радаснабжэньня і каналізацыі, пабудова дзьвюх лазьняў, скончэньне пабудовы пральні і пашырэньне трамвайнай лініі; па Віцебску—680 кватэр, скончэньне пабудовы пральні, пашырэньне трамвайнай лініі; па Гомелі—пабудова кадра 700 кватэр, лазьні і пральні, а таксама пабудова ў гэтых гарадох дамоў для спэцыялістаў з усімі камунальнымі і культурнымі выгадамі.

4. Аднак, ня гледзячы на вялізарныя дасягненьні, сучасная станоўшча гарадзкой гаспадаркі не здавальняе ўзрастаючых запатрабаваньняў рабочых мас і адстае ад агульнага разьвіцьця сацыялістычнага будаўніцтва. Становіцца тормазам далейшага разьвіцьця прамысловасьці.

Баявая задача хутчэйшай ліквідацыі адставаньня гарадзкой гаспадаркі ад агульнага разьвіцьця сацыялістычнага будаўніцтва і рашучага пералому ў тэмпах яго разьвіцьця патрабавалі стварэньня новага камісарыяту камунальнай гаспадаркі.

5. Цэнтральны Выканаўчы Камітэт БССР адзначае, што ход перабудовы гарадзкой гаспадаркі БССР пасьля чэрвеньскага пленуму ЦК УсеКП(б) і рашэньняў ЦК КП(б)Б і СНК БССР аб камунальнай гаспадарцы зусім не адпавядае пастаўленым задачам і патрэбнае пасьпяховаму выкананьню пляну 1932 года.

НК Камунальнай гаспадаркі да гэтага часу не забясьпечыў сапраўднага кіраўніцтва камунальнай гаспадаркай, ня прыняў дастатковых мер па забясьпечаньні захаваньня існуючага жыльлёвага фонду, не перабудаваў па новаму сваю работу па апэрацыйным канкрэтным кіраўніцтве камунальнай гаспадаркай, а праводзіў сваю работу бюракратычна.

Выходзячы з гэтага Цэнтральны Выканаўчы Камітэт БССР прызнае работу НК камунальнай гаспадаркі нездавальняючай.

6. Цэнтральны Выканаўчы Камітэт БССР адзначае, што гарсаветы і райвыканкомы не разгарнулі бальшавіцкіх тэмпаў работы і не скарысталі мясцовых матчымасьцяй для выкананьня пляну будаўніцтва камунальнай гаспадаркі гарадоў і раённых цэнтраў і недастаткова мабілізавалі шырокія масы рабочых на барацьбу за выкананьне пляну камунальнага і жыльлёвага будаўніцтва.

Замест плянавага і апэрацыйнага будаўніцтва гарсаветы і камгасы яшчэ да гэтага часу займаюцца дробнай апекай над камунальнымі прадпрыемствамі, зусім слаба ажыцьцяўляюць мерапрыемствы па ўпарадкаваньні, плянаваньні і кіраўніцтве камунальнай гаспадаркай, не забясьпечылі гарговасьці і камплекснага снабжэньня належнымі будматар'ялямі, у выніку чаго ёсьць вялікая колькасьць распачатага, але не скончанага будаўніцтва.

7. Работа Белжылсаюзу і яго сыстэма на месцах знаходзіцца не на належнай вышыні. Адзначаючы, што ў справе адшуканьня новых будаўнічых матар'ялаў і будаўніцтва з іх новых дамоў палегчанага тыпу Белжылсаюз мае некаторыя дасягненьні, аднак, у той жа самы час жыльлёвы фонд, перададзены на захаваньне жаўтаў знаходзіцца ў запушчаным і бесгаспадарчым становішчы і патрабуе прыняцьця канкрэтных мер па ўзмацненьні пэрсанальнай адказнасьці як самих жыхароў, так і праўленьняў жаўтаў за захаваньне жыльлёвых фондаў, а таксама водпуску сродкаў і матар'ялаў у плянавым парадку для захаваньня і пашырэньня жыльлёвай плошчы.

8. У большасьці камунальных прадпрыемстваў і жыльлёвых гаспадарак адсутнічае гаспадарчы разьлік, не ажыцьцяўляецца мабілізацыя ўнутраных рэсурсаў, існуе абязьлічка, што сьцвердзіць аб няўменьні камунальных органаў і жыльлёвай каапэрацыі перабудаваць сваю работу на аснове рашучага ажыцьцяўленьня шасьці ўмоў тав. Сталіна.

9. Для забясьпечаньня поўнага пералому ў справе камунальнага і жыльлёвага будаўніцтва ў адпаведнасьці з дырэктывамі партыі і ўраду і для далейшага яго пасьпяховага разгортваньня, Цэнтральны Выканаўчы Камітэт БССР пастанаўляе:

а) абавязаць НК камунальнай гаспадаркі, гарсаветы і райвыканкомы безадкладна перабудаваць сваю работу ў напрамку забясьпечаньня сапраўднага канкрэтнага апэрацыйнага кіраўніцтва ўсёй камунальнай гаспадаркай і ў блі жэйшы час дабіцца такіх тэмпаў работы, каб работа камунальнай гаспадаркі была ўзьнята на ўзровень прамысловых прадпрыемстваў, праводзячы барацьбу за ажыцьцяўленьне шасьці ўмоў тав. Сталіна, укараненьне гаспадарчага разьліку, разгортваньне сацспаборніцтва і ўдарніцтва, ліквідацыю абязьлічкі ў камунальнай гаспадарцы, забясьпечыўшы поўнае выкананьне пляну камунальнага і жыльлёвага будаўніцтва 1932 году;

б) выходзячы з таго, што першае паўгодзьдзе 1932 году выявіла значнае недавыкананьне пляну снабжэньня за лік цэнтралізаваных фондаў будаўнічымі матар'ялямі і зусім недапушчальны прарыў у забясьпечаньні мясцовымі будаўнічымі матар'ялямі, даручыць Упаўнаважанаму Наркамцяжу, НК камунальнай гаспадаркі, гарсветам, райвыканкомам і жыльлёвай каапэрацыі на працягу месячнага тэрміну закончыць пабудову заводаў па вырабе новых будматар'ялаў і заводаў па вырабе стандартных дамоў і забясьпечыць поўнае выкананьне пляну вырабу будаўнічых матар'ялаў гэтага году; скарыстаць усе магчымасьці па арганізацыі на місцах падсобных прадпрыемстваў па вырабе будматар'ялаў і абсталяваньня, укараняючы работу рацыяналізацыі і мерапрыемствы па спрашчэньні будаўніцтва шляхам замены дэфіцытных будматар'ялаў недэфіцытнымі, шырока скарыстоўваючы для вырабу адпаведнага абсталяваньня мясцовыя саматужна-прамысловыя арцелі, заводы мясцовай прамысловасьці і г. д.;

в) даручыць НК камунальнай гаспадаркі ў бягучым годзе арганізаваць сталыя вышукальныя работы мясцовых будматар'ялаў як праз арганізацыю гэтых работ сыстэмай органаў камунальнай гаспадаркі, так і шляхам прыцягненьня дасьледчых устаноў (Акадэмія Навук, гэалёвыведка і інш.).

Прапанаваць гарсаветам, райвыканкомам і ўсім будаўнічым арганізацыям правесьці зьніжэньне сабекошту чыгата будаўніцтва ня менш, як на 13% у параўнаньні з фактычным коштам 1931 г. шляхам рацыяналізатарскіх мерапрыемстваў, мэханізацыі работ, укараненьня стандартаў, правядзеньня сапраўднага гаспадарчага разьліку на будаўніцтве і г. д.;

г) даручыць НК камунальнай гаспадаркі і гарсаветам з удзелам прафарганізацый і дэпутацкіх груп ужыць захады да ліквідацыі прарываў камунальных прадпрыемстваў па колькасных і якасных паказьніках (сабекошт, прадукцыйнасьць працы, гаспадарча-эксплёатацыйнае скарыстаньне іх магутнасьці), для чаго выпрацаваць нормы выдаткаваньня паліва і дапаможных прыладаў, правесьці правільную арганізацыю работы, тэхнічнае нармірованьне і правільную аплату працы, згодна выпрацаваных норм, і рад іншых арганізацыйных мер па ўпарадкаваньні работы камунальных прадпрыемстваў, забясьпечыць нармальную і бесьперабойную работу лазьняў і пральняў шляхам перавозу іх на гаспадарчы разьлік, снабжэньне іх палівам, правільнай расстаноўкі рабочай сілы, скарыстоўваючы ўсе віды мясцовага паліва асабліва торфу.

10. Вырашэньне праблемы транспарту ў гарадох патрабуе раду мерапрыемстваў па павялічэньні і найлепшым скарыстаньні транспартных сродкаў, выходзячы з чаго даручыць Наркамгасу, гарсаветам і райвыканкомам забясьпечыць поўнае выкананьне пляну ўраду па завозе і лепшым скарыстаньні транспартных сродкаў.

Даручыць Менскаму і Віцебскаму гарсаветам прадугледзець набыцьцё грузавых плятформ для скарыстоўваньня трамвайнага руху пад грузавыя перавозкі, асабліва ў начны час.

11. Цэнтральны Выканаўчы Камітэт БССР зварочвае асаблівую ўвагу гарсаветаў і райвыканкомаў на неабходнасьць прыняцьця рашучых мер у галіне палепшаньня санітарнага становішча і ачысткі гарадоў.

Даручыць НК камунальнай гаспадаркі разам з НК Аховы Здароўя выпрацаваць арганізацыйныя формы і парадак правядзеньня сыстэматычнай ачысткі населеных месц, асабліва буйных гарадоў.

12. Адзначаючы, што да гэтага часу няма яшчэ чоткага размеркаваньня мясцовай прамысловасьці і камунальных прадпрыемстваў, даручыць НК камунальнай гаспадаркі распрацаваць гэтае пытаньне і ўнесьці на зацьвярджаньне Прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту і Савету Народных Камісараў БССР да 1-га кастрычніка г. г.

Выходзячы з дырэктыў XVII партканфэрэнцыі аб разьвіцьці энэргетычных рэсурсаў і ўлічваючы рост раённых электрастанцый, прапанаваць НК камунальнай гаспадаркі, разам з Упаўнаважаным НКЦяжпрому прадугледзець рэканструкцыю прыстасаваньня гарадзкіх электрастанцый для мэт цэплафікацыі.

13. Адзначаючы яўную недастатковасьць з боку гарсаветаў і жылькаапэрацыі справы захаваньня старога жыльфонду, абавязаць НК камунальнай гаспадаркі і гарсаветы неадкладна дабіцца пералому ў справе захаваньня жыльфонду, забясьпечыўшы поўнае выкананьне ды рэктыў ЦК аб скончэньні работы ўсяго жыльфонду на працягу двух гадоў.

У мэтах упарадкаваньня фінансавай гаспадаркі жаўтаў і забясьпечаньня разгорнутай работы па рамонце існуючага жыльфонду, лічыць неабходным.

а) Савету Народных Камісараў на працягу дзесяці дзён зацьвердзіць нармалізаваны бюджэт жаўтаў, выходзячы з забясьпечаньня поўнага пералому ў мабілізацыі ўнутраных рэсурсаў жаўтаў, недапушчэньня запазычанасьці і ўкарыцьця кватэрплаты, перагляду самой сыстэмай кватэрнай платы;

б) прагледзець парадак і разьмер адлічэньняў з даходаў жаўтаў і ўстаноўленьне замест розных плацяжоў з бюджэту адзінага адлічэньня на амартызацыю з улікам зношанасьці жыльфонду;

в) заставіць у карыстаньні жаўтаў увесь гандлёвы фонд у іх дамох з тым, каб 40 проц. арэндной платы за гандлёвыя памяшканьні заставаліся непасрэдна ў жаўтах, а астатнія 60% перадаваліся ў фонд рэгуляваньня пры гаржылсаюзах для дапамогі маламоцным жаўтам.

14. Даручыць НК камунальнай гаспадаркі, Белжылсаюзу, правесьці месячнік заключэньня дагавораў паміж жаўтамі і камгасамі. На працягу гэтага месячніка правесьці паспартызацыю ўсяго жыльфонду і на гэтай аснове афармленьне дагавораў паміж жыхарамі і жаўтамі па захаваньні жыльлёвай плошчы.

Правесьці масавую кампанію па мабілізацыі грамадзкасьці вакол гэтага месячніка пад лёзунгам барацьбы за палепшаньне жыльлёвых умоў працоўных і захаваньне жыльлошчы.

15. У мэтах укараненьня гаспадарчых адносін да жыльля з боку жыхароў даручыць НК камунальнай гаспадаркі распрацаваць спэцыяльнае палажэньне і ўнесьці яго на зацьвярджаньне Савету Народных Камісараў, прадугледзеўшы ў ім: матар'яльную адказнасьць за захаваньне жыльлёвага фонду і абсталяваньня кватэраналімальнікамі, сыстэматычны кантроль за захаваньнем жыльлёвых фондаў і правядзеньню рамонтаў, меры узьдзейнаньня на жыхароў за разбурэньне жыльлёвага і нежыльлёвага фонду.

16. У мэтах надежнай пастаноўкі зямельнай гаспадаркі ў гарадох даручыць НК Землярэбства і НК камунальнай гаспадаркі правесьці зямельна-гаспадарчае ўпарадкаваньне гарадоў на працягу аднаго году, удакладніўшы межы гарадзкой чарты.

17. Для карэннага палепшаньня зеляненьня гарадоў, у адпаведнасьці з плянам сацыялістычнай іх рэканструкцыі, даручыць НК камунальнай гаспадаркі, гарсаветам і райвыканкомам склясьці плян па зеляненьні гарадоў з тым, каб на працягу бліжэйшых 2-3 гадоў былі-б арганізаваны сквэры, сады, вулічныя дрэвапасадж эньні, паркі адпачынку і культуры ва ўсіх гарадох і рабочых пасёлках, прыцягнуўшы для гэтай мэты шырокія масы працоўных.

Адначасова з гэтым распрацаваць рад мерапрыемстваў на прадмет устаноўленьня належнай аховы ўжо маючыхся насаджэньняў.

18. Адзначаючы неўпарадкаваньне плянаваньня гарадоў і наяўнасьць хаатычнасьці ў іх забудове, даручыць НК камунальнай гаспадаркі фарсіраваць работу па плянаваньні. Усю работу па плянаваньні сканцэнтраваць у органах НК камунальнай гаспадаркі, забясьпечыўшы фінансаваньне намечаных работ з прыцягненьнем да гэтага зацікаўленых устаноў і арганізацый.

19. У мэтах перабудовы гарадзкога дабрабыту, у першую чаргу пралетарскіх цэнтраў і пераводу брукаваньня вуліц у гэтых гарадох на вышэйшую тэхнічную ступень, даручыць НК камунальнай гаспадаркі і гарсаветам рашуча праводзіць перабудову гарадзкога бруку палепшанымі будаўнічымі матар'ялямі (асфальт, брушчатка, асабліва клінкер) і прыступіць да пабудовы клінкерных заводаў у мясцох знаходжаньня клінкерных глін.

У сувязі з пашырэньнем аўтаруху разгарнуць будаўніцтва гарадзкіх дарог і мастоў, а таксама пад'ездаў да гарадоў.

У сувязі з тым, што з пераходам на раённую сыстэму кіраўніцтва раённыя цэнтры набываюць асаблівае важнае значэньне і што зараз павінна быць зьвернута асаблівая ўвага на разгортваньне камунальнага будаўніцтва ў раённым цэнтры,—даручыць Дзяржпляну і райвыканкомам склясьці плян рэканструкцыі камунальнага жыльлёвага будаўніцтва ў раённых цэнтрах, стварыўшы базу для палепшаньня абслугоўваньня дабрабыту працоўных мас. Лічыць неабходным прадугледзець рашучы зрух у справе будаўніцтва раённых цэнтраў пры складаньні другой пяцігодкі.

Для пасьпяховага разьвіцьця камунальнай гаспадаркі на базе маючыхся тэхнічных вышэйшых дасягненьняў у народнай гаспадарцы і ў мэтах належнай пастаноўкі рознастайных галін камунальнай гаспадаркі, даручыць НК камунальнай гаспадаркі распрацаваць мерапрыемствы па арганізацыі навукова-дасьледчай справы па камунальнай гаспадарцы з такім разьлікам, каб у першы год другой пяцігодкі магчыма было-б мець практычнае ажыцьцяўленьне вынікоў навукова-дасьледчай работы.

21. Рашучае значэньне для выкананьня пастаўленых перад камунальнай гаспадаркай задач мае падрыхтоўка і ўкамплектаваньне органаў камунальнай гаспадаркі належнымі кадрамі, чаму Цэнтральны Выканаўчы Камітэт БССР даручае НК камунальнай гаспадаркі разгарнуць сыстэму камунальных навучальных устаноў па падрыхтоўцы вядучых прафэсій па ўсіх асноўных галінах камунальнай гаспадаркі, на базе існуючага камунальнага аддзяленьня пры Магілеўскім тэхнікуме арганізаваць камунальны тэхнікум. Усю работу пабудаваць так, каб з 1933 году адкрыць у БССР камунальны інстытут. Адначасова арганізаваць вучобу без адрыву ад вытворчасьці шляхам непасрэднай падрыхтоўкі работнікаў на прадпрыемствах і будаўніцтве, практыкаваць курсавую вучобу па падрыхтоўцы і перападрыхтоўцы камунальных работнікаў па дэфіцытных спэцыяльнасьцях і разгарнуць сетку школ ФЗВ.

22. Даручыць Прэзыдыуму ЦВК і СНК БССР у бліжэйшы час прыняць меры да ўзмацненьня кіруючага складу НК камунальнай гаспадаркі.

Даручыць НКПрацы, НК камунальнай гаспадаркі, гарсаветам і райвыканкомам на працягу паўтара месяца ўкамплектаваць органы камунальнай гаспадаркі адпаведнымі работнікамі. Устанавіць, што кіруючыя работнікі органаў камунальнай гаспадаркі назначаюцца гарсаветам і райвыканкомам па ўзгадненьні з НК камунальнай гаспадаркі і ня могуць зьнімацца з работы без узгадненьня з апошнім.

23. Цэнтральны Выканаўчы Камітэт БССР заклікае ўсіх працоўных, дэпутацкія групы, сэкцыі гарсаветаў, прафсаюзныя масы, а таксама прапануе НК камунальнай гаспадаркі, гарсаветам і райвыканкомам мабілізаваць усе сілы на выкананьне жыльлёвага камунальнага будаўніцтва 1932 году і на складаньне плянаў другой пяцігодкі, змагаючыся за ажыцьцяўленьне генэральнай лініі партыі, супроць правага апартунізму, як галоўнай небясьпекі на даным этапе, «левымі» загібамі і прымірэнцтвам да іх.

Толькі на падставе правядзеньня ў рабоце ўсімі органамі камунальнай гаспадаркі шасьці ўмоў тав. Сталіна, усцягненьня шырокіх мас працоўных у барацьбу за пасьпяховую рэканструкцыю гарадзкой гаспадаркі і ўжываньня сацыялістычных мэтадаў працы—сацспаборніцтва і ўдарніцтва,—савецкія камунальныя органы выконваюць усклад зеньня на іх партыяй і ўрадам задачы.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. ЧАРВЯКОЎ.

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР М. ГНІЛЯКЕВІЧ.

БОЛЬШ УВАГІ САНІТАРНАМУ СТАНОВІШЧУ ГОРАДУ

«Паскорыць тэмпы разьвіцьця гарадской гаспадаркі Саюзу і асабліва жыльлёвай гаспадаркі, у адпаведнасьці з тэмпамі і плянамі прамысловага будаўніцтва»,—вось асноўная дырэктыва чэрвеньскага пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б.

Акрамя перабудовы буйнейшых гарадоў шляхам шпаркага разьвіцьця жыльлёвага будаўніцтва, у праграму перабудовы была таксама ўключана будаўніцтва буйнейшых аб'ектаў, якія маюць вялікае аздароўнае і санітарнае значэньне: будаўніцтва лазьняў-пральных камбінатаў, пашырэньне водаправоду, каналізацыі, азялененьне гораду, насадка і пабудова паркаў культуры і адпачынку і цэлы шэраг інш. аб'ектаў санітарна-аздароўнага парадку.

Горад Менск—адзін з буйнейшых гарадоў БССР—знаходзіцца ня зусім у добрым санітарным становішчы. Як жа змагаюцца, гарадзкі савет, органы аховы здароўя і санінспэкцыя за санітарнае становішча гораду. Гэтыя органы абмяжоўваюцца адзнэй праведзенай кампаніяй у барацьбе з антысанітарыяй.

Гарсавет і санінспэкцыя ў каждзіку месяцы г-г абвясьцілі месячнік чыстаты. Уся грамадзкасьць мабілізавана на працягу месяцу на ачыстку заплыўшага брудам гораду. Месячнік прайшоў здавальняюча. Горад крыху прыбраўся, ахаяўся. Але скончыўся месячнік і разам з ім скончылася і барацьба за санітарны дабрабыт. Гарсавет ня кіруе апэрацыйнай работай па ачыстцы гораду. Па гораде зноў паплыў смурод, зноў запанавала ўсюды неахаянасьць.

Гірштойн.

Наладзіць работу асэнізацыйных абозаў

Перад гарадзкімі саветамі пастаўлена вялізарная задача палепшаньня бытавых умоў працоўных праз палепшаньне дабрабыту гораду.

Па т. Менску гэту работу вядуць інспэктар дабрабыту, Менкамгас, а таксама і Менгарсавет. Але там, дзе «сем нянек—дзіця без носу». Спынімся на пытаньні ачысткі гораду. Для ачысткі гораду ў Менску ёсьць два асабозы—пры Менкамгасе і пры Менгаржылсаюзе.

Трэба падкрэсьліць, што абодвы асабозы ня ўступаюць адзін аднаму ні ў дрэннай рабоце, так і ў бесгаспадарчасьці і злоўжываньнях. Пачнем: з асабоза Менкамгасу, якім кіруе Гурвіч У Гурвіча досыць «удала» падабраны апарат... для сыстэматычнага самазабясьпечаньня, разбазарваньня тавараў, прызначаных для рабочых, грашовых дакумантаў і проста дзяржаўных прошаў.

Вось факты:

Агент забясьпечаньня асабозу Бэрштэйн, будучы камандыраваны на заготоўку кармоў для транспарту, сыстэматычна п'янствавай на раёне, падаваў фіктыўныя грашовыя дакументы, якія аплачваліся заг. Гурвічам, добра ведаўшым, што дакументы падробленыя. За Бэрштэйнам лічыцца падстраваздачная сума 6.001 руб., на што ня маецца ніякіх апраўдальных дакументаў.

Кладаўшчык Зак купляў крадзенае са складу Саюзпрамкорму сена па таннай цане, прадстаўляў фіктыўныя рахункі аб выплаце грошаў сялянам па дарагой цане, якія фабрыкаваў сам.

Загадчык гаспадаркі Альпяровіч, купляючы авёс, таксама складаў няправільныя рахункі. 4 красавіка г. г. Альпяровіч з 15 фурманкамі самастойна пачаў забіраць вайсковае сена. Бучы затрыманым кладаўшчыком Іванскім, Альпяровіч прапанаваў яму атрымаць хабар сумаю на 100 руб., каб толькі ён не падымаў шуму.

Набытая Бэрштэйнам у м. Шацку дойная карова для сталоўкі асабозу стаяла 2½ месяца у Гурвіча, які карыстаўся яе малаком, пакуль ня быў знойдзены ў справах дакумант аб купалі каровы. Адрыманую мануфактуру ад Белтаддлю, прызначаную для рабочых і на заготоўку кармоў у большасьці разымяркоўвалі сярод сваякоў і служаных канторы.

Вось малюнак работы асабозу Менгаркамгасу. Трэба яшчэ дадаць, што транспарт прыведзены ў страшны заняпад; коні ня маюць сілы працаваць.

Ня лепшае, што робіцца і з асабозам Менгаржылсаюзу. Загадчык гэтага асабозу Мэсэр і кладаўшчык Клоз сыстэматычна п'янствавалі, кіраўніцтвам гаспадаркі ня цікавіліся, чаму на сённішні дзень па асабозе не хапае рознай маемасьці на 4.408 р. 77 кап., не хапае фуражу на 968 р. 69 кап. Конюхі бралі кармы без вагі і ўліку—хто колькі хоча. Кіраўнікі асабозу да таго дапрацаваліся, што ў іх пад носам укралі брычку. У выніку такой работы, транспарт прыйшоў у заняпад, шмат коняй паздыхала.

Работа гэтага абозу поўна злоўжываньняў і гэтак вышла не выпадкова. Заг. асабозу гр. Мэсэр ужо судзіўся 2 разы, у гісторыі яго работы шмат выпадкаў машэнства, пакражы, растрат.

Пракуратура павінна зараз-жа прыцягнуць да крымінальнай адказнасьці ўвесь гэты «букет». Трэба зараз-жа ачысьціць асабозы ад злачынных элемэнтаў і прыняць усе захады да ўзмацненьня асабозаў работнікамі.

Б—н.

Аб камунальнай гаспадарцы гор. Менску

Пастанова Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Беларускай ССР

1. Заслухаўшы даклад старшыні Менскага Гарсавету тав. Валодзька аб ходзе камунальнага будаўніцтва ў гор. Менску, Цэнтральны Выканаўчы Камітэт БССР, прымаючы пад увагу вялізарнае палітычнае значэньне гораду Менску, як цэнтральнага гораду Савецкай Беларусі, цалкам ўхваляе пастанову Савету Народных Камісараў БССР па рэканструкцыі Менскай гарадзкой гаспадаркі.

2. Разам з гэтым Цэнтральны Выканаўчы Камітэт БССР адзначае, што Менскім Гарсаветам ня прыняты неабходныя крокі да поўнага скарыстаньня прадастаўленых яму магчымасьцяй, у зьвязку з чым тэмпы па перабудове Менскай гарадзкой гаспадаркі да апошняга часу застаюцца нездавальняючымі; у значнай меры нездавальняючча абстаіць таксама справа па выкананьні цэнтральнымі ўстановамі ўскладзеных на іх абавязкаў.

3. Цэнтральны Выканаўчы Камітэт БССР даручае Прэзыдыуму ЦВК і СНК БССР вызначанае па пляне будаўніцтва як ўдарнае, забясьпечыць у першую чаргу будаўнічымі матар'ялямі.

4. Даручыць Менскаму гарадзкому савету забясьпечыць сапраўднае апэратыўнае кіраўніцтва справай рэканструкцыі гаспадаркі гораду Менску шляхам цыркай мабілізацыі пралетарскай грамадзкасьці, уцягненьня ў гэтую работу дэпутацкіх груп на прадпрыемствах, разгортваньня шырокай пралетарскай крытыкі і самакрытыкі.

5. Цэнтральны Выканаўчы Камітэт БССР заклікае ўсе гарсаветы і райвыканкомы БССР, на тэрыторыі якіх знаходзяцца прадпрыемствы, якія забясьпечваюць будаўніцтва гор, Менску будаўнічымі матар'ялямі, ужыць усе захады да сваячасовага і поўнага выкананьня ўскладзеных на іх заданьняў.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. Чарвякоў.

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР М. Гнілякевіч.

„4-ты заключны"—у масы

Сёмы тыраж сустрэць поўным завяршэньнем

рэалізацыі і афармленьня падпіскі на пазыку ў вёсцы

Зводка

па рэалізацыі пазыкі на вёсцы на 1 жніўня 1932 г.

НАЗВА РАЁНАЎ	Падпіска па калгасах у проц.	Аднаасобны сэктар у проц.	Разам па вёсцы	Увага
Аршанскі	98,8	1,0	61,4	
Асіпавіцкі	45,2	0,6	15,0	25/VII
Асьвейскі	26,7	2,0	11,3	
Бабруйскі	36,7	0,3	9,1	20/VII
Барысаўскі	51,1	0,8	18,7	20/VII
Бешанковіцкі	20,4	0,8	12.1	25/VII
Брагінскі	55,6	1,1	23,5	
Буда-Кашалёўскі	55,0	1,0	22,7	
Быхаўскі	24,4	—	9,2	25/VII
Бягомльскі	22,6	2,2	22,5	25/VII
Бялыніцкі	30,6	—	16,5	
Барэзінскі	54,8	1,1	19,4	
Веткаўскі	40,8	1,0	11,1	
Вушацкі	50,5	1,3	29,8	25/VII
Гарадоцкі	31,3	0,7	13,5	25/VII
Глускі	45,0	1,9	16,5	
Горанкі	58,9	—	25,9	
Дрыса	60,0	2,9	32,4	25/VII
Дубровенскі	75,0	0,6	31,0	25/VII
Ельскі	77,5	—	35,4	25/VII
Жлобінскі	60,0	1,3	18,6	
Жыткавіцкі	87,5	5,0	60,0	
Заслаўскі	100,0	—	65,0	
Камарынскі	86,0	—	39,1	
Кармянскі	39,0	0,7	15,8	25/VII
Касьцюковіцкі	49,2	3,9	32,8	
Клімавіцкі	121,0	1,3	91,9	
Клічаўскі	56,8	3,3	20,7	
Дзяржынскі	97,0	2,0	65,3	
Капыльскі	27,1	0,8	15,1	15/VII
Чырвонапольскі	49,1	0,9	23,6	
Крупскі	58,6	—	28,6	
Крычаўскі	93,3	—	51,5	25/VII
Лагойскі	98,8	3,3	48,2	
Лёзьненскі	109,6	8,8	64,0	
Лельчыцкі	57,1	8,9	18,1	
Лепельскі	55,6	—	45,5	20/VII
Лоеўскі	47,1	—	20,8	
Любаньскі	60,0	7,2	27,1	
Магілеўскі	61,2	0,3	20,8	
Мазырскі	76,0	13,7	33,7	
Мсьціслаўскі	119,4	27,0	82,9	25/VII
Нараўлянскі	32,7	0,7	9,6	25/VII
Парыцкі	81,6	1,6	23,2	25/VII
Пятрыкоўскі	41,7	2,8	13,7	25/VII
Плешчаніцкі	60,0	—	25,0	25/VII
Полацкі	79,1	1,5	35,8	
Прапойскі	21,7	—	12,3	25/VII
Пухавіцкі	38,2	2,3	11,7	
Рагачоўскі	65,3	0,7	16,9	
Расонскі	68,9	0,8	18,1	25/VII
Рэчыцкі	28,0	—	9,6	25/VII
Сенненскі	18,7	1,0	12,2	25/VII
Сіроцінскі	100,7	1,4	48,8	
Слуцкі	82,2	1,9	44,2	1/VIII
Смалявіцкі	62,9	2,1	20,4	
Старадароскі	60,0	0,7	13,2	25/VII
Старобінскі	100,0	8,4	43,0	25/VII
Сураскі	48,7	2,0	18,0	25/VII
Талочынскі	23,3	0,6	13,6	
Тураўскі	56,3	—	20,0	25/VII
Уваравіцкі	9,0	—	2,9	
Вузьдзенскі	34,6	—	21,1	25/VII
Хойніцкі	15,2	1,5	7,1	
Церахаўскі	60,8	0,8	23,1	25/VII
Чавускі	44,8	0,3	13,1	25/VII
Чачэрскі	29,4	—	9,9	25/VII
Чашніцкі	22,6	1,0	12,8	
Чырвонаслабодзкі	73,7	1,1	14,1	
Чэрвеньскі	67,3	1,3	18,4	
Чэрыкаўскі	67,8	—	44,6	25/VII
Шклоўскі	62,2	0,6	29,8	1/VII
Гомель	57,2	—	20,4	8/VII
Віцебск	92,7	9,4	65,6	
Менск	80,9	7,2	51,2	
Па БССР	59,9	2,0	27,3	

Увага: Зьмяншэньне рэалізацыі па аднаасобным сэктары супроць ранейшых даных адбылася таму, што зараз раёны па аднаасобніках паказваюць выключна паступленьне наяўных грошай, ранейшая частка раёнаў паказвала папярэднюю падпіску аднаасобнікаў

На хвалях самацёку

Становішча ў рэалізацыі пазыкі «4-га завяршальнага» па Самахвалавіцкім сельсавеце патрабуе карэннай перабудовы работы ўсіх грамадзкіх арганізацый. Паводле пляну вызначана 41.290 руб., сельсавет высунуў сустрэчны ў 49.840 руб.

Створаны камсод, штаб па рэалізацыі пазыкі і нават пры штабе выпускалася насьцэнгазэта «Штурмоўка». Да кожнага калгасу і паселішча прымацаваны члены сельсавету. Плян па рэалізацыі пазыкі даведзены да кожнага калгасу і паселішча.

Разгортвалася сацспаборніцтва паміж калгасамі. Высоўвалися сустрэчныя пляны. Здавалася-б, што пры такім уздыме магчыма ў самы кароткі тэрмін ня толькі выканаць, але і перавыканаць заданьне па рэалізацыі пазыкі.

Але гэты ўздым не замацаваны. Вопыты перадавых калгасаў не перанесены ў адстаючыя вучасткі, у выніку справа пайшла самацёкам. Ужо даўно мінулі тэрміны, вызначаныя ўрадам, а плян пазыкі выкананы толькі на 75 проц. Гэта зьвесткі ў сельсавеце толькі на 16-VII, відавочна, што ад 16-VII гэтая работа спынілася, бо зьвестак ня ма ніякіх.

Па калгасах сельсавету вызначана рэалізаваць пазыкі «4-га завяршальнага» на суму 17.550 руб., рэалізавана—13.240 руб., па аднаасобным сэктары—8 730 руб., рэалізавана за наяўны разьлік на 2.020 руб. З афармленьнем падпіскі ня дрэнна. Уся справа перад

Даць у 3 квартале тавараў шырспажыву на 18.000 руб.—

пачэсны абавязак ударнікаў чырвонасьцяжнага скурзаводу „Бальшавік“

Больш увагі ўтыльсыравіне

Аднэй з асноўных сыравінных крыніц для прамысловасьці зьяўляецца максымальнае скарыстаньне ўтылю, якому да сучаснага моманту не аддавалася належнай увагі.

Недаацэнка значэньня ўтылю ў далейшым павінна быць кінута, бо ўтыль вызваляе нас ад прывозу імпорт най сыравіны, моцна пашырае сыравінную базу, прамысловасьці для вырабу дадатковых таварных фондаў для рынку. Апроч таго, утыль зьяўляецца прадметам экспарту з СССР.

Асноўным органам, на які ўскладзена заготоўка, а таксама інструктаж і кіраўніцтва рэшткаю заготоўцаў па БССР—зьяўляецца Белутыль. Да асноўных заготоўцаў адносяцца адпаведныя аб'яднаньні спажывецкай (Балкаапутыль) і прамысловай каапэрацыі) (Белпрамутыльтранс).

Выкананьне пляну 1932 г. па заготоўцы ўтылю на 10 ліпеня ганебнае, фактычна нагляднаецца поўны зрыў заготовак утылю, асабліва па асноўных яго відах.

План на 1-ае паўгодзьдзе 1932 г. выкананы ў наступным выглядзе:

Рызьзё—19,4 проц.
Гума—28,0 проц.
Макулатура—55 проц.
Косьці—41,7 проц.
Рогі—1,8 проц.
Сьцеклабой—57,7 проц.
Кароткае валакно—113 проц.

Паданыя лічбы ясна гавораць аб зрыве пляну заготовак.

Цікава прасачыць работу паасобных заготоўчых арганізацый, за I паўгодзь дзе 1932 г.

Белкаапутыль:
Рызьзё—14,6 проц.
Гума—16,6 проц.
Макулатура—7,9 проц.
Косьці—21,9 проц.
Рогі—32,4 проц.
Кароткае валакно—125,6 проц.

Белпрамутыльтранс:
Рызьзё—15,6 проц.
Гума—11 проц.
Макулатура—7,0 проц.
Косьці—15,5 проц.
Рогі—0 проц.
Кароткае валакно—131,1 проц.

Белутыль:
Рызьзё—50,0 проц.
Гума—33,2 проц.
Макулатура—75,7 проц.
Косьці—69,8 проц.
Рогі—53,8 проц.
Кар. валакно—71 проц.

Гэтыя лічбы выяўляюць, па ўсіх заготоўцах асабліва адстае спажыва-каапэрацыя, г. зн. тая арганізацыя, якая мае найбольшую колькасьць заготоўчых пунктаў, разьмешчаных у глыбінных центрах, і якая бязумоўна магла-б зрабіць вельмі шмат ў справе збору ўтылю. Ганебна адстае ў выкананьні пляну і прамысловая каапэрацыя, якая мае спэцыяльную сетку па аборы ўтылю.

Асноўнымі прычынамі такой работы зьяўляецца тое, што справе заготоўкі ўтылю не аддаецца дастатковай увагі з боку ўсіх заготоўчых арганізацый. Вялікім тормазам невыкананьня пляну зьяўляецца неналаджанасьць узаемаадносін паміж паасобнымі заготоўчымі арганізацыямі. Замест таго, каб адзіным фронтам змагацца за план—адчуваецца ведамсьцвенасьць, канкуренцыя, вера ў самацёк. Усе арганізацыі кідаюцца заготаўляць утыль па адным напрамку, канкуруючы адзін з адным, перахопліваючы адзін у аднаго заготоўлены ўтыль. Такі факт, калі ўтыль абазначаны Белутыльтрансам перахопліваецца на мясцох (у Полацку), работнікамі Белутылю не стымулюе заготовак, не дапамагае рабоце, а толькі дэзарганізуе яе.

Дрэнна пастаўлена работа ў адносінах арганізацыі самой зборкі. Да апошняга часу ня было індывідуальнай апрацоўкі зборшчыкамі насельніцтва, ня было аб'езду зборшчыкамі па паасобных ЖАКТах, не праводзілася масавая агітработа. Уся ўстаноўка ў рабоце бралася выключна на тое, што насельніцтва само прыдзе і здасьць ўтыль. Не мабілізавалася грамадзкасьць як у горадзе, так і на вёсцы. Каапэратывы не мабілізаваны на заготоўкі, пытаньне ў прэсе слаба асьвятляецца.

Не разгорнуты сацыядістычныя мэтады працы—сацспаборніцтва і ўдарніцтва паміж паасобнымі пунктамі па аборы ўтылю, паміж асобнымі зборшчыкамі.

Асноўная доля віны за дрэнную арганізацыю заготовак прыпадае на Белутыль, які павінен быў аддаць больш увагі заготоўкам, чым іншыя сыстэмы. Белутыль павінен наладзіць інструктаваньне ўсіх заготоўцаў.

Трэба адзначыць, што Белутыль яшчэ дагэтуль не ўявіў сабе цалкам свайго значэньня, як органу канцэнтруючага і кіруючага заготоўкамі ўтылю.

Белутыль ня прыняў захаду да сваячасовага складаньня калькуляцыі. У выніку атрымалася, што па Заходняй вобласьці надбаўка на рызьзё ўстаноўлена ў 61 проц., а па БССР—35.

Вельмі марудна ідзе прыёмка ўтылю ад заготоўцаў, прычым ёсьць выпадкі затрымкі заготоўленага ўтылю з-за адсутнасьці нарадаў, па прычыне слабой работы апарату Белутылю і яго нягнуткасьці.

Па каапэрацыйнай сыстэме дагэтуль па ўсіх аўсеньнях ня вылучаны адказныя работнікі (члены праўленьня), якія-б кіравалі і адказвалі за справу заготовак утылю.

Мы патрабуем, каб паміж заготоўчымі арганізацыямі былі ўстаноўлены кантакты Белутыль павінен наладзіць кіраўніцтва і інструктаж, павінен глыбей увайсьці ў работу ўсіх заготоўцаў.

Неабходна наладзіць сувязь з мясцовымі арганізацыямі, укараніць у работу праведзеньне 6-ці умоў тав. Сталіна, прыцягнуць грамадзкасьць, прэсу да работы па заготоўках, шырока разгарнуць сацспаборніцтва і ўдарніцтва — вось асноўныя шляхі для поўнага выкананьня і перавыкананьня пляну заготовак утылю.

А. Б.

Балеткі выраблены на заводзе «Бальшавік» з акідкаў скуры.

Поўнасьцю выканаць плян

План выпрацоўкі тавараў шырокага спажываньня на III квартал па скурзаводзе «Бальшавік» складае 17.900 р. За ліпень месяц патрэбна было выпрацаваць тавараў шырспажыву на 3.400 руб.

На 23 ліпеня месячны плян выкананы на 20 проц. Гэта зьяўляецца вынікам таго, што да сёняшняга дня штат утыльцэху цалкам яшчэ не ўкамплектаваны, што дрэнна арганізавана праца (адсутнічаюць нормы выпрацоўкі, не ўрэгулявана тарыфнае пытаньне), адсутнічае частка неабходнага інвэнтара.

Мэханічны цэх ня выконвае заказаў утыльцэху па абсталяваньні. Утыльцэхам былі заказаны табурэткі і машына па выбіўцы дзірак для ўсадкі колцаў і на працягу 10 дзён гэты заказ ня выконваецца.

Аддзел забясьпечаньня не зварочвае дастатковай увагі на атрыманьне неабходных прадуктаў, як напрыклад, дратвы, нітак, палатна і г. д.

Дагэтуль аддзелам забясьпечаньня яшчэ не атрыманы калодкі з Барысаўскай калодачнай фабрыкі. Сама фабрыка таксама ніяк не адносіцца да вырабу калодак для ўтыльцэху.

Хромавыя цэхі ня выконваюць паставы тэхнічнай нарады аб канчатковай апрацоўцы адыходаў у цэхах, што тармозіць утыльцэх у яго рабоце. Яшчэ дагэтуль не рэарганізаваны парт і прафгрупы ўтыльцэхаў. Скурзавод «Бальшавік» мае ўсе магчымасьці ня толькі выканаць, але і перавыканаць плян выпрацоўкі шырспажыву.

Абвешчаны агульназаводзкі конкурс на лепшую рацыяналізатарскую прапанову па пытаньні арганізацыі вырабу шырспажыву даў першыя вынікі: унесена ўжо 6 прапаноў. Рад перадавых брыгад узялі на сябе рад канкрэтных абавязацельстваў у гэтай справе і адначасова высунулі некаторыя прапановы (брыгада лапчыльшчыкаў).

Адпрацаваць гадзіну ў часе свайго чарговага адпачынку бясплатна для ўтыльцэху, сваімі сіламі штодзенна апрацаваць абрывы на сваіх працэсах для скарыстаньня на шырспажыву—гэткія абавязацельствы перадавікоў ударнікаў.

Але гэта толькі першыя крокі. Вялікая работа наперадзе. Неабходна давесьці плян выпрацоўкі шырспажыву да кожнага рабочага.

«Бальшавік», які выконвае і перавыконвае прамфінплян па ўсіх паказьніках, можа і павінен выканаць і перавыканаць праграму па выпрацоўцы шырспажыву, ліквідаваць прарыў ліпеня, даць у III-м квартале тавараў шырокага спажываньня не менш чым на 18.000 руб.

М. І.

Ад агульных разважаньняў перайсьці да дзеяньняў

На цьвікова-дротавым заводзе «Інтэрнацыянал» за некалькі год назапасілося вялікая колькасьць адкідаў, якія былі раней у эвалюцыі. Некалькі месяцаў таму назад былі праведзены суботнікі па мабілізацыі ўнутраных рэсурсаў, было сабрана некалькі тон адкідаў металю, частка якіх скарыста на патрэбы заводу і на выраб карысных рэчаў. Праз некалькі тыдняў завод зноў аброс утылем.

Зараз становішча зьмянілася. Пасьля праведзенай разьяснальнай работы аб важнасьці вырабу тавараў шырспажыву, на заводзе арганізаваны ўтыльцэх з 10 рабочых—двух сьлесароў, двух кавалёў, а рэшта сталяры. За час свайго існаваньня ўтыльцэх зрабіў 80 стальных малаткоў, 83 шт. жалезных грабель, 83 долаты, 30 табурэтак і інш. Паводле плану, у 1932 годзе ўтыльцэх павінен з адкідаў вытворчасьці вырабіць тавараў шырспажыву на 13.800 руб. Ужо прадана гатовых тавараў на 1.500 руб. Магчымасьцяў для пашырэньня вырабу рэчаў тому назад былі праведзены суботнікі па мабілізацыі ўнутраных рэсурсаў, было сабрана некалькі тон адкідаў металю, частка якіх скарыста на патрэбы заводу і на выраб карысных рэчаў. Праз некалькі тыдняў завод зноў аброс утылем.

Зараз становішча зьмянілася. Пасьля праведзенай разьяснальнай работы аб важнасьці вырабу тавараў шырспажыву, на заводзе арганізаваны ўтыльцэх з 10 рабочых—двух сьлесароў, двух кавалёў, а рэшта сталяры. За час свайго існаваньня ўтыльцэх зрабіў 80 стальных малаткоў, 83 шт. жалезных грабель, 83 долаты, 30 табурэтак і інш. Паводле плану, у 1932 годзе ўтыльцэх павінен з адкідаў вытворчасьці вырабіць тавараў шырспажыву на 13.800 руб. Ужо прадана гатовых тавараў на 1.500 руб. Магчымасьцяў для пашырэньня вырабу рэчаў і перайсьці да дзеяньняў.

Больш пільнасьці

Мерапрыемствы партыі і ўраду ў галіне разгортваньня калгаснага гандлю і ў сувязі з гэтым узмоцнены пад вод с.-г. прадуктаў на базары ў г. Менску былі скарыстаны групай спэкулянтаў і перакупшчыкаў.

Спэкулянт Ціхі Юзэф, маючы патэнт 2-га рангу на вагу агульнага карыстаньня на Віленскім рынку, акружыў сябе групай спэкулянтаў і перакупшчыкаў, праз якую сыстэматычна скупаў на базарах гор. Менску сала, яйкі, масла, мяса, бульбу і інш. с.-г. прадукты і потым іх перапрадаваў па спэкуляцыйных цэнах. Гэта яшчэ не здавальняла спэкулянта Ціхі, карыстаючыся тым, што ён мае вагу агульнага карыстаньня, разам са сваёю жонкаю сыстэматычна абважваў калгасьнікаў і аднаасобнікаў, у якіх ён і яго «кампанія» куплялі прадукты.

Злачынная дзейнасьць спэкулянта Ціхага і яго «кампаніі» паступова пашыралася. Ціхі пачаў займацца перакупкай прадметаў шырспажыву, якія вывозілі каапэрацыйныя арганізацыі на калгасны базар. Гэтыя тавары Ціхі перапрадаваў па спэкуляцыйных цэнах калгасьнікам.

З прычыны слабай барацьбы органаў фінаддзелу з перакупшчыкамі і беспатэнтнымі гандлярамі «Ціхія» памножаліся і павялічваліся. Так, за апошнія паўгода спэкулянты Праліч Максім, Сачук Мікола, Навіцкі Уладзімер, Сьцельнікава Мар'я і Паўлава Мар'я пад кіраўніцтвам спэкулянта Праліча сыстэматычна займаліся скупкай і перапродажам розных тавараў.

Для больш сталага «апэрацыйнага» кіраўніцтва ў правядзеньні сваёй злачынай дзейнасьці Праліч арганізаваў у сваёй кватэры «штаб», куды заяжджалі сяляне аднаасобнікі і перакупшчыкі з Украіны, ад якіх Праліч браў за заезд па 1 рублі з чалавека. Разам з гэтым Праліч у сялян, якія да яго заяжджалі, скупляў с.-г. прадукты і перапрадаваў іх перакупшчыкам з Украіны. У «штабе» Праліча сыстэматычна зьбіралася група спэкулянтаў і перакупшчыкаў і штодзенна п'янствавалі.

Гэтая «кампанія» перакупшчыкаў і спэкулянтаў выкрыта, затрымана і гарадзкой пракуратурай аддана пад суд.

Зараз, калі калгасны гандаль разгортваецца ўдарнымі тэмпамі, органы пракуратуры, міліцыі і гарфа павінны яшчэ больш узмацніць сваю пільнасьць і рашуча змагацца з перакупшчыкамі і спэкулянтамі, якія імкнуцца нажыцца за кошт працоўных мас.

Бірштэйн.

Будаўніцтва 3-ай і 4-ай домны Магнітагорскага заводу.

Як у Мсьціслаўлі дапамагаюць школе

(Ліст асьветніка)

Мсьціслаўскі раён—перадавы, вядучы, але шмат ёсьць недахопаў, шмат чаго робіцца ня так, як сьлед. Вось некалькі фактаў.

У раёне будуецца 5 школ, на якія ніхто ўвагі не зварочвае. Сельсаветы не адчуваюць сябе гаспадарамі гэтага бу даўніцтва. Прэзыдыум РВК не паставіў дакладу ніводнага сельсавету аб ходзе школьнага будаўніцтва, якое ўсюды амаль сарвана. Мазалаўскі сельсавет за 3 месяцы, а гарсавет за 2 месяцы не плацілі зарплаты настаўнікам. Ёсьць ў Мсьціслаўлі 2 дзіцячых сады, але іх мусіць прыдзецца закрыць, бо гарспажтаварыства адмовілася даваць такія прадукты, як хлеб, бульба, малако і г. д.

У дзіцячых дамоў у мінулым годзе забраны зямельныя вучасткі і сродкі вытворчасьці. У гэтым годзе ім далі другія вучасткі, але за 7 кілёмэтраў ад дзіцячых дамоў.

Гарсавет замест адводу новых памяшканьняў пад школьныя майстэрні, за бірае існуючыя, аддаючы іх пад інтэрнат лёнаводу і робіць гэта бяз ведама і згоды райАНА. Сады, якімі карысталіся школы, у гэтым годзе не раданы гарспажтаварыству.

Падрыхтоўка да навучальнага году сваячасова ня была разгорнута. Напісаная пастанова-дырэктыва для сельсаветаў і ячэек КП(б)Б ляжыць нават ненадрукаванаю.

Калі на пленуме РК КП(б)Б стаяла пытаньне аб работе каапэрацыі і была высунута прапанова, каб абавязаць райспажсаюз набыць да пачатку навучальнага году для вучняў абутак і адзеньне, а таксама посуду для школьных сталовак, дык над гэтым пасьмяяліся і прапанову адхілілі.

Усё гэта яскрава сьведчыць аб тым, што ў Мсьціслаўлі не павярнуліся тварам да рэалізацыі пастановы ЦК УсеКП(б) аб пачатковай і сярэдняй школе.

Асьветнік.

Выратуйце калгас ад развалу

(Ліст селькора)

На так даўно на пасёлку Града, Пухавіцкага раёну, абзавёўся ў заможніка Жаўнерчыка Кузьмы вясельле (Жаўнерчык выключаны з калгасу, як заможнік, які разбазарыў маемасьць). На вясельлі былі запрошаны старшыня калгасу «Гарадок» Слуцкі і загадчык гаспадаркі Мазанік Васіль. Гэтыя таварышы два дні гулялі вясельле заможніка, а ў адзін мах з імі і ўвесь калгас два дні ня выходзіў на работу, ня гледзячы на тое, што каля 4 га скошанага сена аж крышылася—так высахла. На трэці дзень старшыня калгасу і загадчык гаспадаркі ішлі дадому, блытаючыся па пасёлку. Відома, што і гэты дзень у калгасе не працавалі.

Запрашаў старшыню калгасу на вясельле заможнік не бяз мэты, відома. Праз дзень старшыня калгасу Слуцкі пашоў разам з заможнікам Жаўнерчыкам на сенажаць і каля ўрочышча «Грыбава» адвёў яму 1 га самай лепшай сенажаці.

А як косіцца сенажаць у самім калгасе? Да сёньня скошана толькі незначная частка яе, бо старшыня калгасу, як нешарок працягнуў яе да жніва. Увесь час было спрыяючае надвор'е. Але Слуцкі і Мазанік і ня думалі свая часова арганізоўваць брыгады па ўборцы сенажаці. У выніку—кампанія гэта сарвана і 92 гектары аграмаджанай жывёлы і коні ўжо напэўна будуць узімку галадаць.

Хто-ж убірае цяпер гэту сенажаць? Дзякуючы бесьперапыннаму п'янству Слуцкага і Мазаніка на сенажаці знайшлі прытулак усе заможнікі і кулакі як нашага сельсавету, так і Блонскага. Гэтая зграя косіць быццам «з паловіны», але якая гэта к ліхой матары «палова», можна меркаваць па такім прыкладзе: грамадзянін вёскі Новасёлкі Гарбачык Янка, які ўзяў у калгасе «з палавіны» касіць сена, прывёз у калгас капы са дзьве, а астатняе ўсё сабе забраў.

У калгасе бесьперапынны крадзёж збожа. Увёсну раскрадзена 136 пудоў аўса, знаходзілі ў кустох пахаваную бульбу, бо калгас увесну быў адкрыты і хто хацеў, той і браў. Сам загадчык гаспадаркай прадавай бульбу спэкулянтам. Перапіска аб пакражы аўсу і да гэтага часу ходзіць ад райкалгасалозу ў міліцыю, а ад міліцыі ў райкалгасаюз і г. д.

І старшыня калгасу Слуцкі, і загадчык гаспадаркай Мазанік бесьперапынна п'янствуюць. А гэтымі днямі Мазанік да таго абнагеў, што паехаў на падсобную гаспадарку «Купальле» і там малатком чуць не забіў калгасьніцу Жаўнерчык Марыю за тое, што она дакарала яго, што ён заўсёды пры яжджае п'яны і абыходзіцца з імі, як былы паліцэйскі. Мазанік аблаяў і апошняга слова другою калгасьніцу Жаўнерчык Гельку з пасёлку «Града». Брыгадзір пасёлку «Іпнатаўка» Сіротка на паседжаньні праўленьня калгасу ўзьнімаў пытаньне аб тым, што загадчык гаспадаркі заўсёды ў іх бывае толькі п'яны. Але старшыня калгасу нават не зьвярнуў на гэта ніякай увагі, бо ён з ім разам п'янствуе.

Усе гэтыя злачынствы добра вядомы ў сельсавеце. Але старшыня сельсавету тав. Клыгун разважае так: «што старшыня калгасу п'янствуе і расьцвае маемасьць мне вядома, але дзе узяць чалавека, які-б замяніў Слуцкага?»...

Да гэтага часу сакратаром сельсавецкай партячэйкі быў тав. Драб (загалчык райана), які амаль штодзень бывае ў калгасе «Гарадок» і добра ведае пра ўсё, што там робіцца. Але Драб ня цікавіцца гэтай справай, як быццам яго гэта і не дакранаецца. Ні якая растлумачальная палітыка-масавая работа ў калгасе не вядзецца. Поўны зажым крытыкі і самакрытыкі. Калгасьнікі запалоханы,—паспрабуй сказаць што-небудзь на Слуцкага, дык ад помсты не абярэшся. Куды-б хто ні пісаў, усё замазваецца чыейсьці рукой. Няма тут партыйнага кіраўніцтва, няма гаспадара, які-б узяў у свае рукі справу.

Патрэбна тэрмінова зрабіць дэталёвую рэвізію грашовых спраў калгасу, выявіць за якія сродкі Слуцкі і Мазанік п'янствуюць, дзе яны падзелі грошы ад праданай увесну бульбы і тэрмінова ачысьціць калгас ад шкодніка, якія яго разбураюць.

К.

АД РЭДАКЦЫІ. Рэдакцыя патрабуе ад Пухавіцкага РК КП(б)Б і РВК сама га тэрміновага расьсьледваньня гэтай справы і паведамленьня аб прынятых захадах.

Час спыніць валакіту

(Ліст тэхніка-інвэнтарызатара)

24 чэрвеня 1932 г. з Магілеўскага гаркамгасу быў пасланы сьпіс членаў ІТР, якія працуюць на інвэнтарызацыі ня г. Магілева, у Магілеўскі райМБІТ для прымацаваньня да каапэрацыі і сталоўкі. РайМБІТ сьпіс зацьвердзіў і адаслаў копіі з яго ў ЦРК. Белгандаль, сталоўкі магазын ІТР. Здаецца, ўсё добра. Але-ж калі мы пашлі прымацоўвацца да магазыну і сталоўкі, дык загадчыкі апошніх накіроўвалі нас у Белгандаль і Каапхарч. Белгандаль і Каапхарч у сваю чаргу накіроўвалі ў ЦРК, а ЦРК у райМБІТ... І зноў пачынай з пачатку. Але-ж гэта цеганіна працаўнікоў па інвэнтарызацыі ня корміць. Мы напісалі заяву ў РКК РСІ, але і ад гэтага не палегчала.

Гэта цеганіна ўжо вядзецца з 24 чэрвеня. Па-мойму час ужо гэтую брыдоту спыніць і прыцягнуць каго належыць да адказнасьці.

Тэхнік-інвэнтарызатар Магілеўскага таркамгасу **Мацьвееў.**

Да гадавіны адозвы ЦК УсеКП(б) і СНК СССР аб грамадзкім харчаваньні

Грамадзкае харчаваньне падпарадкуем задачам сацыялістычнага будаўніцтва

(Гутарка з старшыней ЦП саюзу грамадзкага харчаваньня тав. Герчыкавым)

Адозва ЦК і СНК ад 19 жніўня 1931 г. ва ўвесь рост паставіла задачу мабілізацыі рабочых мас ўсёй пролетарскай грамадзкасьці на барацьбу за палепшаньне грамадзкага харчаваньня, за падпарадкаваньне яго задачам сацыялістычнага будаўніцтва.

З чым падыходзіць БССР да гадавіны гэтай гістарычнай адозвы?

На працягу году ахоплена сацыялістычным спаборніцтвам і ўдарніцтвам звыш пяці тысяч рабочых грамадзкага харчаваньня. Работа гаспадарчых і прафсаюзных арганізацый прасякнута канкрэтным зьместам барацьбы за ажыцьцяўленьне задач, якія высунуты адозвай ЦК і СНК.

Па гарадох БССР сетка сталовак за год павялічылася з 189 да 244. Замест 288 тысяч блюд у дзень у мінулым годзе, зараз прыгатаўляецца 403,4 тысяч блюд, што азначае рост ахопу працоўных мас грамадзкім харчаваньнем звыш 94 проц.

Значна разгорнуты самазагатоўкі. У II квартале г. г. загатоўлена ў па-за плянавым парадку 155,69 тон мяса, 26,14 тон тлушчу, 18,62 тон рыбы, 358.080 шт. яек, 190,26 тон малочных прадуктаў. Гэта дапамагло ўзьняць якасьць і калёрыйнасьць абедаў. Замест 450 да адозвы ЦК і СНК мы маем па рабочых абедах 800,4 калёрый, па студэнцкіх—788 і па школьных 255,6 калёрый.

Большая частка сталовак (142) пераведзена на паблюдную сыстэму, чым павялічаны асартымэнт абедаў. Работнікі 153 сталовак пераведзены на зьдзельную аплату працы, а ў мінулым годзе такіх сталовак было толькі 13. Перавод на зьдзельшчыну даў узьняцьце прадукцыйнасьці працы на 19.26 проц., зьмяншэньне рабочай сілы на 12 проц. павышэньне заработнай платы да 23 проц.

На гаспадарчым разьліку знаходзяцца 211 сталовак. Год таму назад аб гаспадарчым разьліку ў сталоўках ня было нават гутарак.

Трэсты, каапхарчы і паасобныя сталовыя разгарнулі вялікую работу па арганізацыі харчовай базы. На сьвінаадкормачных пунктах у сыстэме грамадзкага харчаваньня налічваецца звыш 4 тысяч галоў дарослых сьвіней і каля 3 тысяч трусоў. Палепшана санітарнае становішча сталовак. Па Менску, Гомелі і Віцебску прымацавана да сталовак 185 дактароў.

Аднак, недахопаў яшчэ засталося шмат. Мы яшчэ далёка ня поўнасьцю пераключылі грамадзкае харчаваньне на службу сацыялістычнаму будаўніцтву. Прадукцыйнасьць працы работніка сталоўкі яшчэ вельмі нізкая. Нагрузка на аднаго рабочага замест 97 блюд у дзень, у сярэднім па БССР дасягае толькі 55 блюд.

У радзе сталовак маюць месца факты разбазарваньня прадуктаў (Метпрам, лесрабкоп, ф-ка «Беларуска», цагельня № 1 і інш.).

Вельмі слаба ўкараняецца гаспадарчы разьлік, з прычыны чаго ёсьць павышэньне накладных выдаткаў па радзе арганізацый і сталовак больш чым на 50 проц.: замест 22,2 проц. накладных выдаткаў мы маем 36,4 проц.

Плян сьвінаадкорму ў першым квартале 1932 г. выкананы толькі на 21,98 проц., у другім квартале—на 27.76 проц. Гэта—вынік апартуністычнай бязьдзейнасьці некаторых трэстаў, каапхарчаў, загадчыкаў сталовак, гаркомаў і райкомаў саюзу. Для выкананьня пляну сьвінаадкорму ў нас былі ўсе магчымасьці і ўмовы.

У большасьці сталовак няма ўліку выхаду гатовай прадукцыі. Ёсьць факты бескантрольнага выдаткаваньня прадуктаў (з-д імя Варашылава, «Сьцяг Індустрыялізацыі», Гомсельмаш і інш.).

Ёсьць факты простага ігнараваньня самазагатовак. Замест таго, каб спусьціцца ў глыбінныя пункты, работнікаў сталовак можна ўбачыць на базары пры закупцы прадуктаў па высокіх цэнах. Як вынік—павялічэньне кошту абедаў (сталоўкі цагельняў у Менску і Віцебску, ф-ка імя Крупскай, ф-ка «Беларуска» і інш.).

Зусім слаба пастаўлен рабочы кантроль над сыстэмай грамадзкага харчаваньня. Гэта яскрава паказала апошняе абсьледваньне на лініі ЦСПСБ. Ёсьць рад выпадкаў, калі рабочым выдаюцца недабраякасныя абеды і на гэта не зьвяртаецца належнай ўвагі (Метпрам). Былі выпадкі і непаўнавагіх абедаў. Напрыклад, на Метпраме катлета замест 100 гр. важыла 30 гр. За гэтым ніхто не сачыў, бо адсутнічалі бракеражныя камісіі і рабочы кантроль. Наогул мы яшчэ не дасягнулі той якасьці абедаў, якая пастаўлена перад намі як адна з цэнтральных задач грамадзкага харчаваньня. Між тым, магчымасьці для гэтага ў нас ёсьць.

Дзень гадавіны гістарычнай адозвы партыі і ўраду павінен яшчэ больш мабілізаваць рабочыя масы і, у першую чаргу, работнікаў грамадзкага харчаваньня на поўную ліквідацыю недахопаў, на поўную рэалізацыю адозвы ЦК і СНК СССР.

Барацьба за дабраякасны абед—лепшага агітатара за грамадзкае харчаваньне—павінна стаць практычным лёзунгам кожнага работніка сталоўкі, кожнага працоўнага. Толькі пры такіх умовах будзе забясьпечана ажыцьцяўленьне гістарычнай адозвы. (Белта).

Усебеларуская сталінская культэстафэта

Прапрацоўка і ажыцьцяўленьне пастаноў ліпеньскага аб'яднанага пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б і III сэсіі ЦВК БССР—

баявая задача эстафэты

Пастановы ліпеньскага пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б і III сэсіі ЦВК БССР павінны быць папулярызаваны сярод шырокіх працоўных мас гораду і вёскі. Адным з мэтадаў для мабілізацыі працоўных мас на рэалізацыю гэтых пастаноў зьяўляецца сталінская культэстафэта.

На аснове прапрацоўкі прапаноў партыі і ўраду, разгортваньня сталінскай культэстафэты — калгас «Новы Шлях», Сушчаўскага сельсавету, Чавускага раёну, дабіўся значных посьпехаў ва ўборцы сенажацяй раённых збожжавых культур, падрыхтоўцы глебы да асеньняй сяўбы (ворыва папару і вываз гною) і г. д.

Гэты факт сьведчыць аб тым, што там, дзе масавая культпалітасьветная работа падпарадкавана чарговым задачам партыі і ўраду—там забясьпечаны і посьпех у рэалізацыі гэтых задач. Але гэтага не жадаюць зразумець у радзе раёнаў. На Віцебшчыне, напрыклад уключыліся ў правядзеньне эстафэты, склалі штаб, але ніякай практычнай работы не разгарнулі.

Загадчык райана Расонскага раёну на запытаньне аб ходзе культэстафэты на Расоншчыне адказаў:

— Выклік Клімаўшчыны раённымі арганізацыямі яшчэ ня прыняты. Мы маем на 16 дамоў сацкультуры 6 работнікаў, ды і тыя выкарыстоўваюцца на мясцох не па прызначэньні.

3-ці маршрут сталінскай культэстафэты вызначаны з мэтаю карэннай перабудовы масавай культпалітасьветнай работы на аснове поўнага ажыцьцяўленьня 6-ці умоў тав. Сталіна. У маршрутах эстафэты ясна сказана аб поўным укамплектаваньні палітасьветных устаноў падрыхтаванымі работнікамі, замацаваньнем іх на 2 гады на сталай рабоце і спыненьні частай перакідкі.

Замест разгортваньня работы па ажыцьцяўленьні ўсіх маршрутаў сталінскай эстафэты, Расонскі райана толькі канстатуе поўны правал і непадрыхтаванасьць культпалітасьветных устаноў да вырашэньня чарговых задач партыі і ўраду.

Ня толькі Віцебск і Расоны, а цэлы рад іншых раёнаў павінны неадкладна ўзяцца за перабудову масавай культпалітасьветнай работы. Папулярызацыя і барацьба за рэалізацыю пастаноў ліпеньскага пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б і III сэсіі ЦВК БССР павінны стаць у цэнтры ўвагі культпалітасьветных устаноў.

Задача партыйных, савецкіх і грамадзкіх арганізацый на мясцох—неадкладна ўключыцца ў правядзеньне сталінскай культэстафэты, узначаліць перабудову масавай культпалітасьветнай работы, падпарадкаваць яе посьпяховаму правядзеньню ўборачнай, збожжазагатоўчай і інш. гаспадарча-палітычных кампаній.

Случчына ідзе па прыкладзе Клімавіцкага раёну

Слуцкі раён уключыўся ў правядзеньне ўсебеларускай сталінскай культэстафэты. На бюро РК КП(б)Б і РК ЛКСМБ намечаны канкрэтныя мерапрыемствы, створаны штаб для кіраўніцтва эстафэтай пры райана.

Штаб мабілізаваў 24 працаўнікоў і 15 ліпеня накіраваў іх у сельсаветы для практычнага кіраўніцтва і арганізацыйнай работы на мясцох. Апрача вызначаных мерапрыемстваў па перабудове масавай культпалітасьветработы, штаб рыхтуецца да скліканьня нарад загадчыкаў дамоў сацкультуры, старшынь культурна-бытавых камісій, сельсаветаў, калгасаў і прафсаюзных ячэек. Вызначаны пункты для арганізацыі новых чырвоных куткоў.

З. Іванаў.

Хаваюцца за „аб'ектыўныя“ прычыны

Па Стара-дароскім раёне сталінская культэстафэта не разгорнута. Заклік Клімавіцкага раёну аб уключэньні ў культэстафэту нідзе не абгаворваны.

Аддзел нарасьветы і РК ЛКСМБ, атрымаўшы дырэктывы аб правядзеньні эстафэты, паклалі іх пад сукно. Рай АНА сваю бязьдзейнасьць тлумачыць «аб'ектыўнымі прычынамі».

— Дырэктывы,—кажа,—мы даўно атрымалі, але загадчык паехаў у вод пуск,—таму і ня ўключыліся.

На мясцох, у сельсаветах, пра культ эстафэту нічога ня ведаюць. Масавая культпалітасьветная работа знаходзіцца ў вялікім заняпадзе. Пастановы ліпеньскага аб'яднанага пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б і III сэсіі ЦВК БССР не рэалізуюцца. Гэтыя — гістарычнай важнасьці рашэньні на раёне не прапрацаваны.

Сельскія дамы сацкультуры (СДСК) у большасьці на замку (Дражненскі, Языльскі, Дараганаўскі і Шчыткаўскі, СДСК працуюць надзвычайна дрэнна.

Па гэтых сельсаветах з-за адсутнасьці культпалітасьветработы быў зрыў плянаў сяўбы. Але гэтыя памылкі ня ўлічаны. Работа СДСК не перабудована ў адпаведнасьці з запатрабаваньнямі ўборачнай. Яна (работа) не перанесена на сенажаць, у поле, у групу і брыгаду, не накірована на ўздым творчай энэргіі калгасных брыгад у барацьбе за скарочаныя тэрміны, зьні шчэньне страт і высокую якасьць уборкі.

Трактарныя калёны МТС зусім не абслугоўваюцца культработай. Не праводзяцца чытка газэт у часе абедзеных перапынкаў, гутаркі — карацей кажучы — культурны адпачынак не арганізаваны.

Арганізаваныя ўзімку 1931 г 30 чырвоных куткоў, зараз спынілі сваю работу.

Радыё ў большасьці дамоў сацкультуры і чырвоных куткох маўчыць. Фонды на бібліятэкі не скарыстаны.

Новадароскі і Дарагачэўскі сельсаветы не забясьпечылі СДСК памяшканьнямі. Кулацкія будынкі для гэтай мэты не скарыстаны.

Раённы дом Сацкультуры ня ўдзельнічае ва ўборачнай. Няма нават памяшканьня.

Патрэбна неадкладна ўключыцца ў культэстафэту, перабудаваць масавую палітасьветную работу і падпарадкаваць яе задачам ўборачнай.

Мікола Шванкоў.

Наладзіць культабслугоўваньне рабочых будаўнікоў

Барысаў. Шмат разоў пісала насьценная газэта групкому № 10 прамжылбу даўніцтва, што адсутнасьць памяшканьня зрывае культурна-масавую работу сярод рабочых будаўнікоў.

Шмат рабочых запісаліся на арганізаваныя курсы нізавога прафактыву, у палітгурток і гурток па аўладаньні тэхнікай, але для правядзеньня занкаў няма месца.

Пытаньне гэта было пастаўлена перад Барысаўскім райпрафсаветам, які замест аказаньня практычнай дапамогі, абмежаваўся бюракратычнай адпіскай «дапамагчы вам нічым ня можам».

Так 800 рабочых і застаюцца бяз культабслугоўваньня.

Смарадзінскі.

Там, дзе грамадзкае харчаваньне пастаўлена добра

Бабруйск. (Ад нашага карэспандэнта) Бабруйскі гарэлачны завод, які на лічвае ў сваім калектыве 80 рабочых, паказаў сапраўды ўдарныя тэмпы ў барацьбе за выкананьне пастаноў Ліпеньскага пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б у галіне палепшаньня грамадзкага харчаваньня.

Цалкам разумеючы, што ад стаўленьня грамадзкага харчаваньня і работа га забясьпечаньня залежыць выкананьне прамфінпляну, пагыбшэньня прафсаюзная арганізацыя і гаспадарнікі ўзяліся рашуча за палепшаньне яго, за стварэньне ўласнае харчовае базы. Да гэтай справы была прыцягнута шырокая грамадзкасьць. Пытаньне аб палепшаньні грамадзкага харчаваньня шырока было абгаворана на агульным сходзе рабочых, на якім прынята пастанова адчыніць уласную сталоўку, шырока разгарнуць самазагатоўкі і ўласны выкарм сьвіней і трусоў.

На сёнешні дзень, за чатыры месяцы барацьбы за стварэньне уласнай харчовай базы, завод мае значныя дасягненьні. Галоўным дасягненьнем, якое характарызуе ўсю работу ў галіне палепшаньня грамадзкага харчаваньня, зьяўляецца той факт, што рабочы гэтага заводу мае магчымасьць атрымаць штодзенна смач

Пра арганізацыю адпачынку рабочых у 1932 г.

Пастанова СНК БССР

На грунце індустрыялізацыі краіны, матар'яльнага і культурнага ўздыму рабочае клясы і ўсіх працоўных за апошнія гады ёсьць значныя посьпехі ў культурна-бытавым абслугоўваньні рабочых у паасобку ў справе арганізацыі адпачынку рабочых.

Арганізаваны новыя дамы адпачынку, значна павялічылася колькасьць рабочых і працоўных, якія накіроўваюцца ў дамы адпачынку і санаторыі, арганізаваны дом адпачынку рабочай моладзі, база адпачынку для рабочых і працоўных БССР на паўднёвым беразе Крыму, пашыраецца арганізацыя прафіляктычных пляцовак і лягераў для дзяцей рабочых, пашыраюцца экскурсіі рабочых і ўсіх працоўных як унутры БССР, так і па ўсім Савецкім Саюзе.

Ня гледзячы на паказаныя посьпехі, справа арганізацыі адпачынку рабочых усё яшчэ адстае ад узросшых культурна-бытавых запатрабаваньняў рабочае клясы і працоўных.

Паасобныя арганізацыі, у абавязкі якіх уваходзіць арганізацыя адпачынку рабочых, ня зусім выразна і чотка кіруюць гэтай справай, ня маюць паміж сабой сталай сувязі і адзінага плану.

Для далейшага палепшаньня арганізацыі рабочага адпачынку, Савет Народных Камісараў БССР **пастанаўляе:**

1. Лічыць мэтазгодным стварэньне пры ЦСПСБ міжведамственнага бюро з прадстаўнікоў ЦСПСБ, Народнага Камісарыяту Аховы Здароўя, Рэспубліканскай Касы Сацыяльнага Страхаваньня і Таварыства Пралетарскага Турызму і Экскурсыі, на якое ўскласьці распрацоўку мерапрыемстваў па арганізацыі рабочага адпачынку, плянаваньне гэтай справы і апэрацыйнае кіраваньне ёю.

2. Прапанаваць Рэспубліканскай Касе Сацыяльнага Страхаваньня забясьпечыць пропуск у 1932 г. праз дамы адпачынку вызначаную адпаведнымі арганізацыямі колькасьць застрахаваных, няўхільна прытрымліваючыся ўстаноўленага процанту пропуску рабочых, абслугоўваючы пераважна рабочых вядучых галін прамысловасьці.

3. Прапанаваць Народнаму Камісарыяту Аховы Здароўя забясьпечыць мэдыка-санітарнае абслугоўваньне ў дамох адпачынку.

Прасіць ЦСПСБ забясьпечыць патрэбную дапамогу ў гэтай справе.

3. Даручыць Рэспубліканскай Касе Сацыяльнага Страхаваньня разам з Народным Камісарыятам Аховы Здароўя распрацаваць пытаньне аб будаўніцтве ад раду новых стацыянарных дамоў адпачынку ў Віцебску і Гомелі і ў іншых мясцовасьцях БССР, якія па сваіх прыродных і кліматычных умовах найбольш спрыяюць здароваму і культурнаму адпачынку.

4. Абавязаць Народны Камісарыят Снабжэньня і Белкапсаюз сваячасова і бесьперабойна забясьпечваць дамы адпачынку харчаваньнем, а Вышэйшы Савет Фізычнае Культуры і Рэспубліканскую Касу Сацыяльнага Страхаваньня разам з ЦСПСБ забясьпечыць належнае культурнае і фізкультурнае абслугоўваньне адпачываючых.

5. Прапанаваць Рэспубліканскай Касе Сацыяльнага Страхаваньня пачаць арганізацыю дому адпачынку ўдарнікаў у г. Менску, а Народнаму Камісарыяту Снабжэньня адшукаць рэсурсы для яго снабжэньня.

6. Прыняць да ведама паведамленьне Таварыства Пралетарскага Турызму і Экскурсіі аб тым, што праз Таварыства будзе ў 1932 г. ахоплена экскурсіямі ў раёне СССР 16.000 чалавек і ўнутры БССР 101.000 чалавек.

Абавязаць Народны Камісарыят Аховы Здароўя арганізаваць належнае мэдыка-санітарнае абслугоўваньне экскурсантаў, а Дзяржплян забясьпечыць будаўнічымі матар'ялямі будаўніцтва сталых турыскіх баз.

7. Прапанаваць Народнаму Камісарыяту Камунальнай Гаспадаркі і гарадзкім саветам прамысловых цэнтраў неадкладна прывесьці ў належны парадак сквэры, грамадзкія сады, а таксама разам з Народным Камісарыятам Аховы Здароўя і Народным Камісарыятам Земляробства адвесьці зялёныя масывы вакол гарадоў, упарадкаваць іх і абсталяваць для арганізацыі рабочага адпачынку, а Вышэйшаму Савету Фізычнай Культуры шырока разгарнуць абслугоўваньне рабочага адпачынку фізкультурнымі прыладамі і гульнямі.

8. Прасіць ЦСПСБ на працягу месяца распрацаваць мерапрыемствы па арганізацыі адпачынку на вытворчасьці (фізкультурныя хвіліны), а таксама па арганізацыі адпачынку ў быце.

9. Прапанаваць Народнаму Камісарыяту Аховы Здароўя і Дзяржпляну неадкладна разгарнуць работу па іспытах Бабруйскай мінэральнай крыніцы, забясьпечыўшы гэтае мерапрыемства патрэбнымі матар'ялямі (трубы і інш., а таксама разгарнуць работу па далейшым вышукваньні лекавых крыніц.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР **М. Галадзед.**
Кіраўнік Спраў Савету Народных Камісараў і Эканамічнага Савету БССР **С. Кандыбовіч.**

26 ліпеня 1932 г.
№ 389
г. Менск.

Пра ход будаўніцтва Магілеўскага трубаліцейнага заводу

Пастанова Эканамічнага Савету БССР

Выслухаўшы даклад тав. Амбражуна са аб ходзе будаўніцтва Магілеўскага трубаліцейнага заводу, Эканамічны Савет БССР адзначае, што ня гледзячы на некаторы пералом у ходзе будаўніцтва пасьля выданьня пастановы СНК за 25 лютага 1932 г. № 94, тэмпы будаўніцтва заводу, ня гледзячы на поўную забясьпечанасьць яго будаўнічымі матар'ялямі, нездавальняючыя.

Дрэнна пастаўлена тэхнічнае кіраваньне будаўніцтвам, ёсьць буйныя недахопы ў якасьці будаўніцтва і скла даньні праектаў будаўніцтва (ацяпленьня, вэнтыляцыі, водаправоду); Белбудаб'яднаньнем і Белмэтэталяаб'яднаньнем ня былі ўжыты своячасова заходы да заключэньня дагавораў і рэалізацыі вылучаных фондаў будаўнічых матар'ялаў, Упаўнаважаны НК Цяжкай Прамысловасьці не ажыцьцявіў дастатковы кантроль за ходам гэтага будаўніцтва і забясьпечаньнем заводу абсталяваньнем у належныя тэрміны.

Выходзячы з гэтага, Эканамічны Савет БССР **пастанаўляе:**

1. Лічыць неабходным пусьціць трубаліцейны завод у Магілеве не пазьней 5—7 лістапада 1932 г.

2. Даручыць Белбудаб'яднаньню, пад адказнасьць тав. Бамні, неадкладна зьнішчыць усе дэфэкты ў будаўніцтве і вінаватых у недобраякасным будаўніцтве прыцягнуць да адказнасьці. Скончыць складаньне праектаў на паасобныя часткі будаўніцтва (ацяпленьне, вэнтыляцыя і каналізацыя), а так сама складаньне каштарысу і забясьпечыць скончэньне будаўнічых работ не пазьней 15 верасьня.

3. Абавязаць Белбудаб'яднаньне вызначыць адказнага тэхнічнага кіраўніка будаўніцтва і забараніць частую зьмену тэхнічнага персаналу.

4. Прапанаваць Белбудаб'яднаньню і Белмэтэталяаб'яднаньню ўжыць усе захады да своячасовага атрыманьня вылучаемых фондаў будаўнічых матар'ялаў і не дапускаць перабояў у ходзе будаўніцтва, а таксама давесьці колькасьць рабочых у суадпаведнасьць з тэрмінамі скончэньня будаўніцтва.

5. Абавязаць Белмэтэталяаб'яднаньне неадкладна пачаць поўнае забясьпечаньне заводу патрэбным абсталяваньнем, якое вырабляецца ў БССР.

6. Прапанаваць Удаўнаважанаму НК Цяжкай Прамысловасьці ўстанавіць сталы кантроль за ходам будаўніцтва і своячасовым пускам заводу.

Старшыня Эканамічнага Савету БССР **М. Галадзед.**
Кіраўнік Спраў Савету Народных Камісараў і Эканамічнага Савету БССР **С. Кандыбовіч.**

29 ліпеня 1932 г.
№ 156.

У СССР ЁСЬЦЬ СВОЙ КАЎЧУК.



Яраслаўскі завод сынтэтычнага каўчука.

ПАСТАНОВА САВЕТУ НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ БССР

пра скліканьне 13 жніўня гэтага году аб'яднанага пасяджаньня Савету Народных Камісараў і Эканамічнага Савету для разгляду кантрольных лічбаў народнай гаспадаркі і культуры БССР на другую пяцігодку

Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляе:

1. Склікаць 13 жніўня г. г. а 11 гадзіне раніцы Аб'яднанае пасяджаньне Савету Народных Камісараў і Эканамічнага Савету для разгляду кантрольных лічбаў народнай гаспадаркі і культуры БССР на другую пяцігодку.

2. Разасласць гэтую пастанову ўсім народным камісарыятам, рэспубліканскім установам, гарадзкім саветам і раённым выканаўчым камітэтам, якія павінны падрыхтаваць усе матар'ялы па другой пяцігодцы і падаць іх у Дзяржплян у найкарацейшы тэрмін.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР
М. ГАЛАДЗЕД.
Кіраўнік Спраў Савету Народных Камісараў і Эканамічнага Савету БССР
С. КАНДЫБОВІЧ.

2 жніўня 1932 г.
г. Менск.

Аб арганізацыі Аршанскага пасялковага савету

Пастанова Прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Беларускай ССР

1. У мэтах лепшага абслугоўваньня працоўных чыгуначнага вузлу ст. Вор ша арганізаваць Аршанскі пасёлкавы савет на правах гарадзкога савету, пад парадкаваўшы яго Аршанскаму райвыканкому.

2. Даручыць Аршанскому райвыканкому і Арг-інструктарскаму Аддзелу Прэзыдыуму ЦВК у месячны тэрмін арганізаваць выбары пасялковага савету паводле палажэньня пра гарадзкія саветы і дакладна вызначыць межы Аршанскага пасялковага савету.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага камітэту БССР **А. Чарвякоў**
Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага камітэту БССР **Гнілякевіч**

Выканаем плян збожжазагатовак датэрмінова

ПЕТРЫКАЎ. (Па тэлеграфе ад нашага спэцкора). Перадавыя калгасы Петрыкаўшчыны адзначылі дзень пер шага жніўня арганізацыяй чырвоных абозаў са збожжам новага ўраджаю.

Калгасы Капаткевіцкага сельсавету здалі (прадалі) дзяржаве 1383 кг збожжа. Калгас «Чырвоны Кастрычнік», Сыметаніцкага сельсавету, здаў 900 кг збожжа.

Калгасынікі запэўніваюць, што плян збожжазагатовак выканаюць датэрмінова.

Пялінскі.

Мабілізаваць шырокую пралетарскую грамадзкасьць

на баявую сустрэчу навучальнага году

Загадчыкам культпропаў ГК і РК КП(б)Б

Падрыхтоўка да новага навучальнага году, у большасьці раёнаў праходзіць яўна нездавальняюча. Вакол гэтай важнейшай справы не згуртавана патрэбная ўвага партыйных, савецкіх, прафэсыянальных, камсамольскіх, гас падарчых арганізацый, не прыцягнутана дапамогу шырокая пралетарская грамадзкасьць.

Між тым, ад належнай падрыхтоўкі да новага навучальнага году залежыць якасьць працы школ у 1932-33 навучальным годзе і пасьпяховая падрыхтоўка пэдкадраў.

Культпроп ЦК КП(б)Б прапануе загадчыкам Культпропаў ГК і РК КП(б)Б узяць пад свой непасрэдны нагляд і кіраўніцтва падрыхтоўку да новага навучальнага году, мабілізаваўшы шырокую пралетарскую грамадзкасьць на вырашэньне наступных задач: скончэньне будаўніцтва і рамонту школ і памяшканьняў навучальных установаў; пашырэньне школьнае плошчы за кошт асла баненьня і перадачы школам б. школьных будынкаў; набыцьця новага і рамонту старага інвэнтару і абсталяваньня, вучоту падлягаючых абавязковаму навучаньню; камплектаваньне школ і навучальных установаў пэдкадрамі і правядзеньне вярбоўкі адпаведных кантынгэнтаў у пэдустановы; забясьпечаньне школ і пэдустаноў апалам на ўвесь 1932-33 навучальны год; забясьпячэньне школ падручнікамі, навучальнымі прыладамі, сшыткамі, алоўкамі; папаўненьне школ і пэдустаноў палітэхнічным і лябораторным абсталяваньнем; правядзеньне рамонту сталовак і кухань з мэтай арганізацыі грамадзкага харчаваньня для студэнтаў і гарачых сьнеданьняў для вучняў і мабілізацыі для гэтай мэты неабходных натуральных і грашовых фондаў.

Для вырашэньня усіх гэтых задач, Культпроп ЦК КП(б)Б прапануе шырока скарыстаць абвешчаны па лініі НКА конкурс на лепшую падрыхтоўку школ і пэдустаноў да новага навучальнага году, забясьпечыўшы ўключэньне ў конкурс усіх грамадзкіх арганізацый, а таксама саміх школ і пэдустаноў..

Нам. Заг. Культпропа ЦК КП(б)Б—ЗАЛАТУХІН.

„У аснову ўсёй работы па ўборцы паставіць барацьбу са стратамі" (З паст. СНК і ЦК)

42 кілё збожжа ад зграбаньня каласоў, 1 кілё ад зерняўлавіцеля на га—вось вынікі барацьбы са стратамі ў Смалявіцкім раёне

СМАЛЯВІЧЫ. (Па тэлефоне ад нашага спэцкора). Да 1 жніўня плян ўборкі азімых па Смалявіцкім раёне выкананы на 79 проц. у тым ліку саўгасы 87 проц., калгасы—67,1, аднаасобнікі —86. Гэтымі днямі скончылі ўборку жыта і пераключыліся на малацьбу Амяльянаўскі, Дрычкаўскі і Смалявіцкі сельсаветы; скончылі жніва таксама саўгасы Антанопаль, Шыбяны, Зарэчча і імя Леніна. Набліжаюцца да скончэньня ўборкі рад іншых сельсаветаў.

За апошнюю пяцідзёнку ліпеня прырост уборкі па раёне вызначаецца ў 31 проц. Такім чынам, Смалявіцкі раён, заняўшы першае месца па сенаўборцы, высунуўся ў перадавую калёну і па жніве. Аб гэтым досыць выразна гавораць даныя ходу ўборкі па раёнах рэспублікі. Ужо на 25 ліпеня Смалявіцкі раён, будучы раёнам цэнтральнай зоны, заняў першае месца сярод раёнаў сваёй зоны і пятае месца сярод раёнаў паўднёвай зоны. Але гэты паказьнік ня будзе яшчэ выразным, калі не падкрэсьліць той факт, што на 25 ліпеня суседнія раёны, як напрыклад, Лагойскі, меў 1,8 проц., Менскі—4,2 пр., Барысаўскі—4,4 проц. убраных азімых.

Адсюль відавочна, што Смалявіцкі раён ва ўборачнай задае тон у рабоце ня толькі суседнім раёнам, усёй цэнтральнай зоны, але і пераважнай большасьці раёнаў паўднёвай зоны. Гаворачы аб тэмпах уборкі кі ў якім разе не выключаем якасьць уборкі,— барацьбу са стратамі.

Паклаўшы ў аснову ўсёй работы па ўборцы барацьбу са стратамі Смалявіцкі раён па прыкладзе Крыму расопачаў жніва зонны у васковай сьпеласьці. Гэта дало магчымасьць адхіліць перастой жыта і высыпаньне зерня і сабраць дадатковыя сотні цэнтнэраў.

Другім мерапрыемствам, якое пакладзена ў аснову барацьбы са стратамі—гэта правільная расстаноўка і скарыстаньне мэханічнай сілы. У працэсе ўборкі сама практыка работы падказвае аб неабходнасьці перакідкі машын. І тыя гаспадаркі, якія першыя скончылі жніва, перакідаюць машыны ў парадку сацыялістычнай дапамогі ў гаспадаркі, дзе гэтых машын няма, або маецца значная плошча засеву азімых, вялікая няўпраўка, і жыту пагражае перастой. У парадку такой узаемадапамогі гэтымі днямі накіраваны 8 жняярак у калгас «Гудок», 2 жняяркі ў калгас «Колас», перакідаюцца машыны і ў іншыя калгасы.

Трэцяе мерапрыемства барацьбы са стратамі—гэта тэхніка-вытворчыя мерапрыемствы, зерняўлавіцелі, зграбаньне каласоў і інш.

Прыклады барацьбы са стратамі даюць саўгасы раёну. Саўгас імя Леніна да 1-га жніўня скончыў уборку і скірдаваньне жыта на плошчы 122 га, і прыступіў да малацьбы. Гэты саўгас распачаў жніво ў васковай сьпеласьці. На жніво былі пушчаны жняяркі пры зерняўлавіцелях, сьледам за імі па скошаным іржышчы—конныя граблі пры падвойных скабах (уздоўж і поперак).

Падагульваючы папярэднія вынікі барацьбы са стратамі, саўгас дэманструе такімі паказьнікамі: зграбаньне каласоўсеў у сярэднім дало 42 кілё збожжа на 1 га, або 5.124 кілё на ўсю плошчу, зерняўлавіцель на 1 га дае 1 кілё а разам зграбаньне з зерняўлавіцелямі далі ў сярэднім 5.246 кгр. Ня менш важным мерапрыемствам, як гэта бачна на прыкладзе ўборкі саўгасу, мае такое мерапрыемства, як зграбаньне каласоў. Той факт, што на іржышчах нашых палёў мы губім сотні тон зерня ў раскіданым калосьсі па трабуе сур'ёзнай увагі да такога мерапрыемства як зграбаньне каласоў. У радзе калгасаў Смалявіцкага раёну ў сёлетнюю ўборку ў якасьці мерапрыемства па барацьбе са стратамі зграбаньне каласоў пастаўлена на першае месца. У ажыцьцяўленьне гэтага мерапрыемства вялікую ролю адыгрываюць конныя граблі. Нажаль іх тут у калгасах раёну надзвычайна мала. Амаль палова калгасаў раёну ня мае конных грабель. Гэта ў сваю чаргу адбіваецца на справе барацьбы са стратамі.

Разглядаючы ход уборкі ў раёне, пленум РК КП(б)Б паставіў перад усёй партарганізацыяй баявую задачу—скончыць уборку азімых не пазьней 5 жніўня і пераключыцца на ўборку яравых і збмалоту, пачаўшы зараз-жа выдачу авансаў і 15-га жніўня прыступіць да масавай сяўбы азімых.

Падкрэсьліваючы недастатковую барацьбу са стратамі ў радзе гаспадарак, пленум увёс рад канкрэтных мерапрыемстваў па барацьбе са стратамі і ў прыватнасьці паставіў задачай аба вязковае зграбаньне каласоў па ўсіх палетках жніва. Для рэалізацыі пастаноў раённага камітэту партыі і рэалізацыі пастаноў пленуму ЦК і ЦКК на вёску пасланы ўвесь раённы партактыў.

ЗА ГРАНІЦАЙ

Паліцыя расстрэльвае дэманстрацыю бастуючых рабочых

ВІЛЬНЯ. Забастоўка гарадзкіх рабочых у Горадне працягвалася 6 дзён—з 14 па 20 ліпеня. 14 і 15 ліпеня адбылося некалькі бурных дэманстрацый бастуючых рабочых. У паўторнай дэманстрацыі 15-га ліпеня прымалі ўдзел жонкі і дзеці рабочых.

У часе разгону дэманстрацыі ранена 49 рабочых, з іх 7 цяжка. Разганяючая рабочых паліцыя, была спушчана на падпоена.

Вялізарнае ўражаньне ў горадзе зрабілі камуністычныя лістоўкі, заклікаючыя рабочых да забастоўкі на 14 ліпеня.

У Горадні працягваецца ўжо больш тыдня забастоўка рабочых фабрыкі Ляйнэса.

У дзень 11 ліпеня працоўныя Зах. Беларусі і асава дэманстравалі свае сымпатыі да СССР

У сувязі з днём 11 ліпеня (гадавіна вызваленьня БССР ад белапалякаў) у радзе гарадоў і раёнаў Заходняй Беларусі адбыліся масоўкі, на якіх прымаліся рэзалюцыі прывітаньня працоўным БССР. (Масоўкі ў Вільні, пад Ляцвяровам, на Палесьсі).

11-га ліпеня працоўныя Лунінцу масава наведалі брацкую могілу 40 рабочых, расстраляных у 1920 годзе белапалякамі.

Пад вечар паліцыя разагнала сабраўшыхся і разбурыла пабудаваны на могілках памятнік.

Сяляне Зах. Украіны паўстаюць супроць акупантаў

ВАРШАВА, 2 жніўня. (Уласн. інф. «Праўды»). Не насьпеў яшчэ закончыцца паліўны суд над 4 украінскімі сялянамі, якія абвінавачваліся ў тым, што яны быццам узначальвалі сялянскі бунт у Ліскім павеце (Зах. Украіна), як газэты паведамляюць аб новым выступленьні украінскіх сялян у павеце Камень-Кашырскім.

Як паведамляе «Ілюстраваны Кур'ер Цодзенны» ад 26 ліпеня, у аднэй з валасьцей гэтага павету быў забіты валасны старшыня, які выклікаў нанавісьць сялян, як агент польскай акупацыйнай улады, калёнізатар і шпіён. Паліцыя наладзіла аблаву, але сустрэла ўзброены адпор.

Недалёка ад вёскі Смаляры паліцэйскі патруль наткнуўся на атрад дзікам ад 20 да 30 чалавек. Паліцэйскія пачалі стральбу. «Завязаўся рэгулярны бой,—піша «Ілюстраваны кур'ер цодзенны». Пры перастрэлцы 2 члены «банды» (польская газэта называе рэвалюцыйных украінскіх сялян бандытамі) паранены ці забіты; іх забралі з сабой таварышы».

Для расправы з сялянамі была мабілізавана паліцыя двух паветаў і атрад войскаў. Яны адбілі «банду», якая адступіла ў непраступныя балоты і лясы ў ваколіцах рэкі Стаход.

Паліцыя працягвае прасьледаваньне паўстаўшых сялян.

1 жніўня ў капіталістычных краінах

Масавыя арышты рэвалюцыйных дзеячоў у Фінляндыі

ГЕЛЬСЫНГФОРС, 2. Для таго, каб супрацьдзейнічаць выступленьням рэвалюцыйных рабочых у дзень 1-га жніўня паліцыя і ахранка прымянілі энэргічныя меры і ў прыватнасьці правялі масавыя арышты сярод рэвалюцыйных дзеячоў. Аднак насупэрэкі паліцэйскаму тэрору ў дзень 1-га жніўня ў радзе прамысловых цэнтраў фінляндзкай кампартыяй было распаўсюджана шмат лістовак і вывешаны агітацыйныя плякаты і чырвоныя сьцягі.

У Гельсынфорсе ў 5 розных частках гораду было вывешана 5 чырвоных сьцягаў. Адзін з іх быў умацаваны ў цэнтры гораду ля нацыянальнага тэатру і настолькі высока, што для таго, каб яго зьняць, паліцыі давядзецца выклікаць пажарную каманду.

За распаўсюджваньне лістовак і разьвешваньне чырвоных сьцягаў арыштавана некалькі рабочых.

Стан аблогі па ўсёй Румыніі

ВЕНА, 2. Як паведамляюць з Бухарэсту, усе ўзброеныя сілы Румыніі ў дзень першага жніўня былі прыведзены ў баявую гатоўнасьць. У Бухарэсце і ў прамысловых гарадох усе грамадзкія будынкі былі заняты войскам. Ахранка правяла масавыя пераграджальныя арышты западозраных у камунізьме.

Вечарам 1-га жніўня ў Бухарэсце рабочыя арганізавалі дэманстрацыю па галоўных вуліцах з рэвалюцыйнымі песьнямі. Паліцыя разагнала дэманстрантаў. 70 рабочых арыштавана. У Галацы, Ясах, Бэндэрах, Клаўзэнбургу, Чарновіцах і інш. гарадох дэманстравала мноства рабочых, прычым паліцыя нападала на дэманстрантаў і правяла шматлікія арышты, а ў Чарновіцах арганізавала зьбіваньне дэманстрантаў.

Антыяпонскі рух у Кітаі расьце

ТОКІЁ. 3-VIII. Японскі друк поўны паведамленьнямі аб антыяпонскім руху ў Шанхаі. Агенцтва «Сімбун Рэнго», спасылаючыся на зьвесткі Асакскіх эканамічных колаў зазначае, што антыяпонскія таварыствы аднавілі дзейнасьць і зноў пагражаюць рэпрэсіўнымі мерамі кітайскім купцом, якія набываюць японскія тавары.

Дырэктар аб'яднаньня японскіх бавоўняных прадпрыемстваў у Шанхаі Фунасу прадракае яшчэ большае ўзмацненьне антыяпонскага руху ў сувязі з ходам падзей ў Жэхэ і Манчжурыі. Фунасу зазначае, што калі раней кіруючая роля ў байкоце належала антыяпонскім таварыствам, дык цяпер само насельніцтва добраахвотна адмаўляецца ад пакупкі японскіх тавараў.

Фунасу падкрэсьліў, што японскія прадпрыемцы ў Шанхаі занепакоены мытнай палітыкай манчжурскага ўраду патрабуюць, каб прадукцыя японскіх прадпрыемцаў не абкладалася пошлінамі пры ўвозе ў Манчжурыю.

Японскія самалёты бамбардыруюць Жэхэ

МУКДЭН. Становішча ў правінцыі Жэхэ застаецца напружаным. Паведамленьне аб вызваленьні Ісімота аказалася няправільным. Згодна паведамленьню газэты «Маньчжубяо», штаб японскага войска ў Цзіньчжоў з прычыны адсутнасьці адказу на патрабаваньне вызваленьня Ісімота, парашыў паслаць у Жэхэ карную экспэдыцыю для бамбардыроўкі антыманчжурскага войска.

Паводле паведамленьня японскага друку японскія бамбавозы барбарды равалі Суньцзяджунь (на паўночны захад ад Цзіньчжоў) і рад пагранічных пунктаў. Выведчы японскі аэраплян быў абстрэлены кітайскімі партызанамі і змушаны быў вярнуцца.

Канцэнтрацыя кітайскага войска ў раёне Шанхаю

ШАНХАЙ, 3-8. Японскае агенцтва «Прэс-Юніён» паведамляе: «бесьперапыннае павялічэньне кітайскіх узброеных сіл у раёне Шанхаю выклікае вялікую небясьпеку ў афіцыйных японскіх колах. Прадстаўнік японскіх афіцыйных колаў выказаў сумненьне ў шчырасьці нанкінскага ўраду ў адносінах да шанхайскай згоды і адзначыў, што павялічэньне ваенных сіл у Чапэі і Наньдао «супярэчыць духу даных Кітаем абяцаньняў».

АПАВЯШЧЭНЬНЕ

Парткалегія ЦКК КП(б)Б наведамляе што 13 жніўня ў Менску будзе працаваць ПТ ЦКК КП(б)Б. па разглядзе партспраў Смалявіцкага і Заслаўскага раёнаў і 15-VIII у Дзяржынску будзе працаваць выязная ПТ ЦКК па разглядзе партспраў Дзяржынскага і Вузьдзенскага раёну.

Намі выклікаюцца наступныя таварышы: **на 13-VIII—32 г.—у Менску.**

1. Шчакоўіч І. С.—(Заслаўе).
2. Асіповіч Т. А.—(Заслаўе).
3. Дударчык Я. Ю.—(Заслаўе).
4. Жывіца О. С.—(Заслаўе).
5. Аглушэвіч Ц. К.—(Заслаўе).
6. Фурсэвіч М. С.—(Смалявічы).
7. Паўлоўскі А. П.:—(Койданава)
8. Купоўскі А. Я.—(Смалявічы).

На 15-VIII—32 г. у Дзяржынску:

1. Калганаў Л. Д.—(Узда).
2. Карачун С. Я.—(Койданава).
3. Кавецкі Я. В.—(Койданава).
4. Фешчанка Д. І.—(Койданава).
5. Касьцюк А. І.—(Койданава).
6. Курылоўскі А. П.—(Койданава).
7. Паўдоўскі Ф.—(Койданава).
8. Арэхаў З. І.—(Койданава).
9. Качан М. А.—(Койданава).
10. Табакоў Х. Э.—(Койданава).
11. Апроніч А. М.—(Койданава).
12. Царэшка М. Д.—(Узда).
13. Сушынскі Я.—(Узда).
14. Прыемка І. А.—(Узда).
15. Матэцкі А. Л.—(Узда).
16. Сянкевіч У. К.—(Узда).
17. Байкоўскі Я. Т.—(Узда).
18. Карачун Н. Р.—(Койданава).
19. Маркасьян І. Л.—(Койданава).
20. Растуноў Н. М.—(Койданава).
21. Шадурскі І. А.—(Койданава).

Яўка памянёных таварышоў абавязкова.

Член ПК ЦКК КП(б)Бел.
Сьцяпанк.

Адказны рэдактар П. ШАСТАКОЎ.

Менск. Беларускага Дзяржаўнага яўрэйск. тэатру БССР

Гастролі Беларускага 2-га Дзяржаўнага тэатру
2, 3, 4, 5, 6, 7 М. ІЛЬІНСКІ.
Вясна
Пач. а 8 з палов. Білеты ў рабкасе і ў касе тэатру

ГУКАВЫ КІНО-ТЭАТР „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА"
Каса з 1 г. дня
Гукавы мастацкі фільм
Пуцёўка ў жыцьцё
Штодзенна 4 сэансы. Пачат. 5-30, 7-15, 9 і 10-45
Каса ад 4 гадз.

КІНО „ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ"
Каса ад 12 гадз.
Усходні мастацкі фільм
Чадра

З 1 жніўня распачала апэрацыйную **працу** 1932 г. Беларуская кантора банку
сацыялістычнага земляробства
Кантора банку часова зьмяшчаецца ў памяшканьні Белканторы Дзяржбанку (другі паверх). КІРАЎНІЦТВА БАНКУ

ЛЕНІНГРАДЗКІ ІНСТЫТУТ СЬВІНАГАДОЎЛІ,
які рыхтуе заатэхнікаў-сьвінаводаў вышэйшай кваліфікацыі і інжынэраў-аграномаў па кормаздабычы
абвяшчае
АСЕНЬНІ ПРЫЕМ СТУДЭНТАЎ
на факультэты: сьвінагадоўлі і кормаздабываньня дзенных і вячэрніх аддзяленьняў.
У інстытут прымаюцца асобы абодвага полу ва ўзросьце ад 17 да 35 год.
У першую чаргу прымаюцца: сяляне-калгасьнікі, рабочыя саўгасаў, індустрыяльныя рабочыя і іх дзеці.
Тыя, што скончылі рабфакі, школы і дзевяцігодкі (ня больш 3-х год назад), с.-г. жывёлагадоўчыя тэхнікумы (пры наяўнасьці 3-гадовага стажу) — прымаюцца бяз і с п ы т у. Астатнія трымаюць іспыты па грамадазнаўстве, матэматыцы і фізыцы.
Прыём заяў з 1 ліпеня па 1 верасьня 1932 г. Іспыты з 1-га па 15 верасьня 1932 году. Пачатак заняткаў 1 кастрычніка 1932 г.
На вячэрніх аддзяленьнях абодвых факультэтаў заняткі без адрыву ад вытворчасьці ў гор. Ленінградзе і Краснагвардзейску.
Заявы накіроўваць па адрасе: Ленінградзкая вобласьць, гор. Краснагвардзейск, Інстытут Сьвінагадоўлі.
Аб тым, якія неабходна падаць дакументы паступаючымі, паказана ў аб'яве ў газэце «Социалистическое земледелие» ад 29 чэрвеня 1932 г.
ДЫРЭКЦЫЯ.

Абавязковая пастанова № 65

Менскага гарадзкога савету рабочых, сялянскіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў

2 жніўня 1932 г.

„Аб адмене абавязковай пастановы Менгарсавету № 55 за 3 красавіка 1932 г. „Пра парадак упарадкаваньня тараўпаковачнай гаспадаркі".

Менскі гарадзкі савет рабочых, сялянскіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў **пастанаўляе:**

1. Абавязковую пастанову Менскага гарадзкога савету № 55 за 3 красавіка 1932 г. „пра парадак упарадкаваньня тара-упаковачнай гаспадаркі" адмяніць на падставе Збору законаў БССР ад 1931 г. № 19, паст. № 155.

Старшыня гарсавету Валодзька
Сакратар Люцько

МАЦУЙЦЕ АБАРОНУ СССР
Набывайце білеты імя 3-га пленуму ЦС АСОАВІЯХІМУ
3-га жніўня Асоавіяхім пачынае рэалізацыю
2.000.000 білетаў коштам па 3 руб. спэцыяльнага выпуску імя 3 пленуму ЦС Саюзу Асоавіяхіму СССР
У фонд абароны краіны будуць укладзены 6.000.000 руб.
Разыгрываецца 20.000 выйгрышаў на суму 960.000 руб.

5 выйгрышаў на 10.000 руб.		Кругасьветнае падарожжа тэрмінам на 4 месяцы.
15 „ „ 5.000 руб.		Кругасьветнае падарожжа тэрмінам на 2 месяцы.
35 „ „ 3.000 руб.		Падарожжа па Эўропе тэрмінам на 1 з палов. месяцы.
45 „ „ 1.000 руб.		Падарожжа па Эўропе тэрмінам 1 месяц.
100 „ „ 500 руб.		Палёты на самалёце па БССР на працягу 15 дзён.
300 „ „ 200 руб.		Вэлёсыпэд, скураное альбо цёплае паліто па выбары.
1.000 „ „ 100 руб.		Часы, скуранка, швэйныя машыны, гарнітуры і г. д.

ПАМЯТАЙ, што набываючы білеты Асоавіяхіму ты ўзмацняеш абарону СССР

Віцебскі фінансава-уліковы тэхнікум НКФБ
абвяшчае АСЕНЬНІ НАБОР
на першы курс у колькасьці 240 чал.
Тэхнікум мае мэтай падрыхтоўку вучотнікаў-эканамістаў сярэдняй кваліфікацыі для прамысловасьці і сельскай гаспадаркі. Тэрмін навучаньня тры гады.
У тэхнікум прымаюцца бяз іспытаў—асобы, скончыўшыя 7-гадовыя школы ці роўныя ім навучальныя ўстановы. Іншыя асобы павінны трымаць іспыты паводле агульнаўстаноўленых правіл—па грамадазнаўстве, белмове, літаратуры, матэматыцы, фізыцы і прыродазнаўстве.
Асобы, жадаючыя паступіць у тэхнікум, павінны падаць заяву, прыклаўшы наступныя дакументы: 1) аб узросьце, 2) аб адносінах да вайсковай павінасьці (копія), 3) аб адукацыі, 4) аб стане здароўя, 5) аб сацыяльным і матар'яльным становішчы паступаючага і яго бацькоў, 6) для калгасьнікаў—даведку калгасу, для аднаасобнікаў копію акладнога лісту за 1931 г. 7) анкету, пасьведчаную прафэсыянальнымі і савецкімі арганізацыямі раённага маштабу.
Паказаць, на якім аддзяленьні жадае навучацца (прамысловым ці сельскагаспадарчым і дзённым ці вячэрнім без адрыву ад вытворчасьці).
Асобы, залічаныя студэнтамі тэхнікуму, забясьпечваюцца стыпэндыяй і інтэрнатам на агульных падставах эканамічных тэхнікумаў.
Узрост паступаючага ад 18 да 32 год. Заявы прымаюцца да 25 жніўня 1932 г. па адрасе: Віцебск, Ніжня-Набережная, № 42.
Іспыты будуць праводзіцца з 25 жніўня па 1 верасьня 1932 году.
Аб залічэньні і часе заняткаў будзе паслана паведамленьне кожнай асобе.
ДЫРЭКЦЫЯ.

Завочны сэктар вышэйшага пэдінстытуту
АБВЯШЧАЕ АСЕНЬНІ ПРЫЕМ
на наступныя аддзяленьні:
літаратурнае, гістарычнае, эканамічнае і пэдагагічнае.
Прымаюцца рабочыя, калгасьнікі, сяляне і служачыя, якія маюць сярэднюю асьвету.
Пры заяве неабходна прыкладаць наступныя дакументы: аб асьвеце, сацыяльным паходжаньні, месцы працы і заверaную анкету.
ЗАВОЧНЫ СЭКТАР ВПІ.

2 жніўня па дарозе з вёскі Пяцеўшчыны, Самахвалавіцкага сельсавету
знойдзен бумажнік з грашыма
Згубіўшага просьба зьвярнуцца ў Капыльскую раймілiцыю за атрыманьнем

Згублена дамавая кніга дому № 6 па Вакзальнай вул. гр. САВІЦ